Спартыўная драма — яго любімы жанр у кіно, а па жыцці спорт — лепшыя лекі і выратаванне. Тэлевядучы Станіслаў Ліпскі калі ставіць мэту перад сабой, то робіць усё патрэбнае, каб дасягнуць яе. СТАР. 3

Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ

«Мы з розных краін, мы належым да розных пакаленняў, у нас розныя погляды. Але тое, што нас яднае, нашмат большае: гэта тое, што мы — беларусы». У Мінску прайшоў VI з'езд беларусаў свету. СТАР. 6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

26 ЛІПЕНЯ 2013 г. ПЯТНІЦА № 137 (27502) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА РАЗГЛЕДЗЕЎ КАДРАВЫЯ ПЫТАННІ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка разгледзеў кадравыя пытанні. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Кіраўнік дзяржавы назначыў:

Іванова Валерыя Мікалаевіча — намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

Крата Аляксандра Міхайлавіча — першым намеснікам старшыні Вышэйшай атэстацыйнай камісіі;

Прэзідэнт таксама даў згоду на назначэнне:

Кудравец Алены Аляксандраўны — генеральным дырэктарам закрытага акцыянернага таварыства «Беларуская калійная кампанія»;

Гарбачова Андрэя Аляксеевіча — кіраўніком адміністрацыі Цэнтральнага раёна г. Гомеля;

Дарашэвіча Віктара Рыгоравіча — старшынёй Чачэрскага райвыканкама;

Пазняка Аляксандра Рыгоравіча — кіраўніком адміністрацыі Савецкага раёна г. Мінска;

Галоўчыца Алега Браніслававіча — старшынёй Любанскага райвыканкама;

Качаноўскага Ігара Міхайлавіча — намеснікам міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя;

Седзіна Васіля Аляксеевіча — намеснікам міністра сельскай гаспадаркі і харчавання;

Аўраменкі Аляксея Мікалаевіча — намеснікам міністра транспарту і камунікацый;

Жамойцінай Наталлі Уладзіславаўны — намеснікам міністра транспарту і камунікацый;

Шэнца Леаніда Васільевіча — першым намеснікам міністра энергетыкі;

Кулакоўскага Валерыя Лявонцьевіча — намеснікам міністра юстыцыі.

Звяртаючыся да Алены Кудравец, Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што ёй добра знаёмая сітуацыя ў калійнай галіне. Прэзідэнт адзначыў, што «гэта не толькі сфера калійных угнаенняў, гэта сфера гандлю, прытым у глабальным маштабе. Гэта не тое, што прыйшоў, дзесьці прыкупіў нечага, потым перапрадаў, як у нас цяпер гэта прынята, гэта — вялікая палітыка ў сферы продажаў».

«Вы актыўны ўдзельнік той камісіі, якая вывучала сітуацыю на калійным рынку наогул, вы аналізавалі работу Беларускай калійнай кампаніі, якая займаецца рэалізацыяй калійных угнаенняў Беларусі і Расійскай Федэрацыі. Больш за тое, вы добра ведаеце сітуацыю не толькі ў нашага вытворцы, але і расійскага. І, напэўна, я так мяркую, такіх спецыялістаў, як вы, у краіне нямнога, якія так валодалі б сітуацыяй па продажах калійных угнаенняў», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Валерыя Іванова мы перавядзём на іншую работу. У нас такіх вялікіх, прэтэнзій да яго быццам няма, але яму цяжка працаваць у гэтай сферы, паколькі ён з ёй ніколі не сутыкаўся, — сказаў Прэзідэнт. — Таму мы яго вопыт будзем выкарыстоўваць тут, унутры краіны, ён будзе прызначаны на іншую пасаду».

«Нам ні ў якім разе нельга страціць расійскую кампанію, таму што мы больш магутныя, мы самая магутная кампанія па рэалізацыі калійных угнаенняў, калі мы з расіянамі дзейнічаем заадно. Але, натуральна, не трэба забываць і беларускія інтарэсы, таму што з таго боку — прыватная кампанія. І ў дзяржавы, і ў прыватніка не заўсёды супадаюць у нюансах мэты, але, тым не менш, як яны, так і мы хочам прадаць больш і даражэй, гэта натуральна, і ў гэтым галоўным нашы інтарэсы супадаюць, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Трэба ўзяць пад кантроль усе патокі, па якіх бы лініях яны не рэалізоўваліся, і паглядзець на цэны».

Аляксандр Лукашэнка даручыў таксама сур'ёзна прааналізаваць сітуацыю ў калектыве БКК.

Звяртаючыся да кіраўнікоў мясцовых выканаўчых органаў, Прэзідэнт падкрэсліў, што яны павінны іграць вялікую ролю ў развіцці краіны і асабліва ў рабоце з людзьмі. Аляксандр Лукашэнка са шкадаваннем заўважыў, што, нягледзячы на тое, што ў краіне прынята рашэнне ўзмацніць ролю асноўнага звяна вертыкалі ўлады, усё яшчэ не ў поўнай меры задзейнічаны старшыні райвыканкамаў, кіраўнікі гарадскіх адміністрацый.

Кіраўнік дзяржавы папярэдзіў мясцовую вертыкаль аб недапушчальнасці карупцыі ў іх рабоце.

«З-за таго, што мы вельмі жорстка рэалізуем курс у краіне на парадак, сумленнасць і справядлівасць (гэта ніякая не кампанейшчына, гэтаму пытанню мы заўсёды ўдзяляем вялікую ўвагу, і праходзяць мерапрыемствы антыкарупцыйнай накіраванасці, прытым у цвёрдым ключы), я проста вас, як і ўсіх, чарговы раз хачу папярэдзіць, што тут ніякіх паблажак быць не можа, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Тут я вам не памочнік і зберагчы вас ад гэтых артыкулаў крымінальнага кодэкса я не змагу. Гэта прынцыпова. Таму я перакананўча вас прашу заўсёды мець гэта на ўвазе».

ЗЁЛКАВЫ ВОДАР НА СВЯЦЕ ЛЕТА

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«Сонца і кветак свята. Дзень лета ў Рачэні» — гэткую назву атрымала першае свята новага Любанскага раённага фестывалю па захаванні традыцый і абрадаў «Аграфэст». Свята ладзілася ў аграгарадку Рачэнь — вёсцы з захаванымі старадаўнімі традыцыямі. Адной з вясковых захавальніц з'яўляецца старэйшая жыхарка Зоня Рудзько (на фотаздымку), якой выпаў гонар даваць на свяце своеасаблівы майстар-клас — па прыгатаванні напояў з купальскіх кветак. Многія сакрэты збору і выкарыстання лекавых зёлак Зоня Ігнатаўна пераняла ў дзяцінстве (яшчэ да вайны) ад сваёй старэйшай аднавяскоўкі — шаптухі і знахаркі Акуліны Рубін.

— Цяпер настаў час і мне перадаваць маладзейшым багаты досвед, — кажа Зоня Ігнатаўна. — Шкода не выкарыстоўваць тое, што шчодра дае нам матухна-прырода.

Пра самабытны фестывальны праект «Аграфэст», задуманы любанцамі для вывучэння і захавання лепшых мясцовых традыцый, чытайце на ... старонцы. СТАР. 8

ЦЫТАТА ДНЯ

Генадзь БАЛБАТОЎСКІ, дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва пры Савеце Міністраў:

«Аднаўленне работы лагераў працы і адпачынку — галоўная навацыя цяперашняй дзіцячай аздараўленчай кампаніі. У першую змену была арганізавана работа 540 лагераў працы і адпачынку, з іх 507 — з дзённым знаходжаннем, аздаравіліся 9,7 тыс. дзяцей. Многія арганізацыйныя пытанні яшчэ не абкатаныя, адчуваецца насцярожанасць працадаўцаў (для іх прадастаўленне працоўнага фронту падлеткам — дадатковая адказнасць). Другі момант: не падрыхтаваная база для размяшчэння такіх лагераў на кругласутачнай аснове. Але калі шчыра, не чакалі, што будзе такая вялікая зацікаўленасць з боку дзяцей, бацькоў, педагогаў. Гэтыя лагеры вельмі запатрабаваныя».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.07.2013 г.

Долар ЗША	8860,00	▲
Еўра	11710,00	▼
Рас. руб.	272,50	▼
Укр. грыўня	1088,99	▲

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 26°	
Віцебск	+ 20°	
Гомель	+ 22°	
Гродна	+ 27°	
Магілёў	+ 20°	
Мінск	+ 24°	

ВЫНІКІ ПРАВЕРАК У СФЕРЫ СТРАХАВАННЯ, ЭНЕРГАЗБЕРАЖЭННЯ

ДАЛОЖАНЫ ПРЭЗІДЭНТУ

Аляксандр Лукашэнка 25 ліпеня прыняў з дакладам Старшыню Камітэта дзяржаўнага кантролю Аляксандра Якабсона.

Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў далажыць аб праблемах, якія ў апошні час знаходзяцца на разглядзе ў КДК, і прапанаваў абмеркаваць шэраг кадравых пытанняў у сувязі з аптымізацыяй, якая прайшла ў гэтым ведамстве. На сустрэчы таксама абмяркоўваліся вынікі праверак у сферы страхавання, энергазберажэння.

Аляксандр Якабсон праінфармаваў Прэзідэнта аб практыцы рэалізацыі Указа №488 «Аб некаторых мерах па папярэджанні незаконнай мінімізацыі сум падатковых абавязацельстваў», накіраванага на барацьбу з ілжэструктурамі. Кіраўніку дзяржавы было даложана аб зробленых у гэтай сферы мерах і значным эканамічным эфекце ад прыняцця дадзенага дакумента.

У прыватнасці, фінансавай міліцыяй КДК актывізавана работа па выкрыцці і выключэнні «ценявых» схем рэалізацыі тавараў як на знешнім, так і на ўнутраным рынку. У 2013 годзе спынена незаконная дзейнасць трох злачынных груп, якія займаліся ценявым экспартам малочных тавараў у Расію. Заведзена 8 крымінальных спраў.

Аляксандру Лукашэнку таксама даложана аб тым, як выконваецца яго даручэнне па ўзмацненні кантролю на рынку страхавых паслуг. У гэтай сферы выяўлены праблемы як на заканадаўчым узроўні, так і ў арганізацыі работы страхаўшчыкоў, у тым ліку Белдзяржстраха і Белэксімгаранта.

КДК выпрацаваны меры па выпраўленні сітуацыі, якая склалася на страхавым рынку, адпаведныя прапановы накіраваны ў Савет Міністраў.

Асобна Прэзідэнту было даложана аб кантролі за рэалізацыяй энерга- і рэсурсазберагальных мерапрыемстваў, у першую чаргу ў сістэме ЖКГ. Раней адпаведная работа была праведзена ў дачыненні да сістэмы Міністэрства энергетыкі.

«Сёння мы ў сістэме жыллёва-камунальнай гаспадаркі таксама ўбачылі шэраг сур'ёзных праблем, якія не ўкладваюцца ў дырэктыўныя дакументы, звязаныя з рэсурса- і энергазберажэннем. Павелічэнні сабекошту работ у выніку кладуцца на тарыфы і на насельніцтва», — сказаў Аляксандр Якабсон.

Што тычыцца аптымізацыі ў структуры КДК, то, паводле слоў Аляксандра Якабсона, колькасць работнікаў скарацілася больш чым на 26%. У гэтай сувязі з кіраўніком дзяржавы былі ўзгоднены некаторыя кадравыя пытанні.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

■ Прыватная арэнда

«ЖОРСТКІ» ДЭФІЦЫТ ЗДЫМНАГА ЖЫЛЛЯ ЎЗВІНЦІЎ ЦЭНЫ

Мінімальны кошт арэнды аднапакаёвак у Мінску дасягнуў мяжы ў 400 USD

Істотнае павелічэнне попыту на арэнду прыватных кватэр «стартавала» яшчэ ў другой дэкадзе чэрвеня. Тады зусім слабенькія бюджэтныя кватэры ў старых дамах магчыма было зняць за 280—300 долараў. Чакалася выпраўленне сітуацыі, калі на рынак арэнды традыцыйна трапляе дадатковы аб'ём кватэр сезоннага тыпу ад дачнікаў, якія летам жывуць за горадам. Гэтая тэндэнцыя сёлета не спрацавала. Пра сённяшняе развіццё сталічнага рынку арэнды і прагнозы на бліжэйшую і доўгатэрміновую перспектыву карэспандэнту «Звязды» расказвае намеснік генеральнага дырэктара Цэнтра гандлю нерухомасці «ПАКАДАН» Аксана ЛУКАШЭВІЧ.

ВЫБАРУ ПРАКТЫЧНА НЯМА

Калі ў першай дэкадзе чэрвеня назіраўся недахоп параўнальна таннага арэнднага жылля, то зараз сітуацыя істотна змянілася і не ў лепшы бок. Напрыканцы ліпеня сталіца атрымала сапраўды жорсткі дэфіцыт амаль усіх тыпаў стандартнага арэнднага жылля. Мінімальны кошт арэнды аднапакаёвых кватэр цяпер дасягнуў 370—400 долараў. Тут лепш нават казаць, што да 400 долараў варыянтаў у агенцтваў практычна няма. Яно часам і бывае, але...

Існуючы ажыятаж прывёў да таго, што будучыя кватаранты здымаюць аднапакаёўкі за 400 долараў практычна ў любых раёнах горада і з любой камплектацыяй. СТАР. 2

ПРЫПЯЧЭ ДА ПЛЮС 33

Сёння тэрыторыя нашай краіны застанецца ў зоне панізжанага атмасфернага ціску, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.

Таму будзе няўстойлівае надвор'е, калі паўсюдна чакаюцца кароткачасовыя дажджы, а ў асобных раёнах навальніцы. Тэмпература паветра ўдзень 19—25 цяпла, па паўднёвым захадзе краіны — да плюс 27 градусаў.

У суботу стане цяплей. Невялікія дажджы чакаюцца толькі ў асобных раёнах Беларусі. Уначы і раніцай туман. Прагназуецца, што ўначы на суботу будзе плюс 10—16 градусаў, а ўдзень — 22—28 цяпла. Сапраўды камфортнае надвор'е будзе паспадарыць у нас у нядзелю. Пераважна ўвогуле без ападкаў, толькі ў асобных раёнах невялікі кароткачасовы дождж. Раніцай слабы туман. Тэмпература паветра ўначы на нядзелю плюс 10—17, удзень 23—28 цяпла, а па паўднёвым захадзе — да плюс 29—31 градуса.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, летняе надвор'е са спякотай вернецца ў Беларусь у пачатку наступнага тыдня. У панядзелак будзе сонечна і без ападкаў. Тэмпература паветра ўначы на панядзелак плюс 10—17, удзень — 23—29 цяпла, а на паўднёвым захадзе краіны — нават да плюс 30—33 градусаў. У аўторак у паўднёва-заходняя раёны Беларусі завітае чарговы атмасферны фронт, які прынясе кароткачасовыя дажджы і навальніцы. А вось на астатняй тэрыторыі Беларусі сонечна і спякотна. Тэмпература паветра ўдзень плюс 25—30 градусаў, а ў Брэсцкай і Гомельскай абласцях — да 33 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

НАЙБУЙНЕЙШАЯ ЧЫГУНАЧНАЯ КАТАСТРОФА Ў ІСПАНІІ

У выніку крушэння цягніка на поўначы Іспаніі загінулі, па ўдакладненых звестках, 77 чалавек, больш за 140 атрымалі раненні, паведамляюць інфармагенцтвы. Ратавальнікі, якія працуюць на месцы чыгуначнай катастрофы, па стане на раніцу 25 ліпеня знайшлі целы 73 загінулых. Яшчэ чацвёра пацярпелых памерлі ў бальніцы. На момант выхаду нумара яшчэ не ўсе вагоны былі абследаваны. Колькасць ахвяр можа вырасці. Пасажырскі цягнік Alvia, які рухаўся з Мадрыда ў Фероль, увечары 24 ліпеня сышоў з рэек пры пад'ездзе да станцыі Сант'яга-дэ-Кампастэла. Чатыры вагоны цягніка, па словах відавочцаў, некалькі разоў перакуліліся, а затым урэзаліся адзін у аднаго. У саставе знаходзіліся 218 пасажыраў і чацвёра супрацоўнікаў чыгуначнай кампаніі. Па звестках іспанскіх СМІ, хуткасць цягніка ў момант аварыі значна перавышала дапушчальную. Пры дазволеных на гэтым участку 80 кіламетрах у гадзіну, састаў, па папярэдніх звестках, развіў хуткасць да 220 кіламетраў у гадзіну.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванні Каралю Іспаніі Хуану Карласу I у сувязі з гібеллю людзей у чыгуначнай катастрофе.

НАСЛЕДНАГА ПРЫНЦА БРЫТАНІІ НАЗВАЛІ ДЖОРДЖАМ АЛЯКСАНДРАМ ЛУІ

«Дзіця будзе вядомае як Яго Каралеўская Высокасць прынц Джордж Кембрыджскі», — гаворыцца ў заяве Кенсінгтонскага палаца. Імя Джордж было адным з найбольш папулярных у букмекераў.

ПАКЕЦІКІ З ГАРБАТАЙ НЕБЯСПЕЧНЫ?

Танная гарбата ў пакеціках павышае ўзровень фторыстых злучэнняў у арганізме чалавека да небяспечных паказчыкаў. Гэта пагражае пашкоджаннем зубоў і касцей, адзначае The Daily Mail. Супрацоўнікі Універсітэта Дэрбі, якія ацэньвалі чай, настойваюць: вытворцы павінны ўказваць на ўпакоўцы з пакецікамі наяўнасць фтору. Згодна з рэкамендацыямі, дарослы чалавек не павінен спажываць больш за 3-4 міліграмы фтору за дзень. Тым не менш у танных пакеціках знайшлі дозу, якая перавышае дзённую норму на 75-120 мг. Вядома, што чай назапашвае ў сабе фтор па меры росту. Больш за ўсё гэтага злучэння ў дарослым лісці. Менавіта старое лісце ідзе на вытворчасць таннай гарбаты. У выніку атрымліваецца прадукт з высокай канцэнтрацыяй фтору. А ён можа выклікаць болі ў суставах, мышачную слабасць, астэапароз.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

СОТНІ СІРЫЙСКІХ ПАЎСТАНЦАЎ СКАРЫСТАЛІСЯ АМНІСТЫЯЙ АСАДА

У сірыйскім канфлікце намеціўся раптоўны паварот. Некаторыя паўстанцы сталі паволі складаць зброю і пераходзіць на бок урадавых сіл, якія падтрымліваюць прэзідэнта Башара Асада. Пакуль гаворка ідзе толькі пра сотні перабежчыкаў, піша The Daily Telegraph. Аднак, як адзначае «Коммерсант», калі інтэграцыя апазіцыянераў у мірнае жыццё пройдзе паспяхова, іх прыклад могуць падтрымаць тысячы аднадумцаў. Прычыны, якія падахвочваюць паўстанцаў скласці зброю, — абвешчаная ўладамі амністыя і расчараванне ў ідэалах рэвалюцыі. «Я змагаўся за рэвалюцыю, але цяпер, я думаю, мы страцілі тыя ідэалы, за якія ваявалі»,— цытуе The Daily Telegraph словы былога байца паўстанцкіх сіл з горада Рака. Ён расказаў, што калі яго горад захапілі экстрэмісты, яго сям'я была вымушана ўцякаць у іншае месца, якое кантраляваліся ўрадавыя сілы, бо заставацца было занадта небяспечна. «Асад жудасны, але альтэрнатыва яшчэ горш», — лічыць былы паўстанец.

КАРАТКА

Максімальныя рознічныя цэны на асобныя віды цыгарэт з фільтрам у жніўні павялічацца ў Беларусі на 5-21,2 працэнта. Падаражанне закране ў асноўным імпартныя цыгарэты.

Міжведамасны савет па рэкламе створаны ў Беларусі. Узначаліў савет міністр гандлю Беларусі Валянцін Чаканаў. У склад савета ўвайшлі прадстаўнікі Мінэканомікі, Мінінфарма, Мінкультуры, Мінспорту і турызму, аблвыканкамаў, Мінгарвыканкама і іншыя.

Расія прапануе ўвесці 10-працэнтную пошліну на ўвоз у МС турыстычных аўтобусаў.

Дырэктар гасцініцы «Планета» выкінуўся з балкона 8 паверха ўласнай кватэры. Следства мяркуе, што асноўная версія гібелі мужчыны — самагубства, аднак разглядаюцца і іншыя версіі.

Рашэннямі выканкамаў ў Дзятлаўскім, Зэльвенскім, Іўеўскім, Мастоўскім, Навагрудскім, Астравецкім, Свіслацкім, Слонімскім, Смаргонскім раёнах Гродзенскай вобласці зоны, свабодныя ад курэння, вызначаны ў гарадскіх парках і скверах.

■ Прыёмная кампанія—2013

АПОШНІ ДЗЕНЬ! ЁН ЦЯЖКІ САМЫ...

Учора, 25 ліпеня, скончыўся прыём дакументаў у беларускія ўстановы вышэйшай адукацыі на «бюджэтныя» месцы. Жарсці кіпелі і ў сценах БДУ.

Да страты прытомнасці ў гэты дзень не даходзіла, але панерваваццa давялося ўсім. У апошні дзень часцей можна было сустрэць абітурыентаў з «групай падтрымкі». Мамы і таты не толькі давалі апошнія парады ў выбары прафесіі, але і накіроўвалі сваіх дзяцей у кабінеты і нават спрабавалі запоўніць за іх дакументы! Адразу адчувалася, што бацькі хвалююцца ці не больш за сваіх дзяцей. Да ўдзелу ва ўступнай кампаніі прыцягнулі нават бабуль і дзядуляў, якія па тэлефоне надыктоўвалі колькасць пададзеных дакументаў і рабілі свае прагнозы ў паспяховасці на паступленне ўнукаў.

Раззнаёміўшыся, абітурыенты групкамі хадзілі з кабінета ў кабінет, абмяркоўвалі свае шанцы і будучае навучанне. Развіталіся абавязковым «Поспехаў!» і пажаданнямі пабачыцца ўвосень у сценах універсітэта. Ужо ў якасці студэнтаў!

Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.

ТАРЫФНАЯ СТАЎКА МОЖА ПАВЫСІЦЦА, СІСТЭМУ АПЛАТЫ БАЛЬНІЧНЫХ СКАРЭКТУЮЦЬ

Пра гэта стала вядома ўчора падчас пасяджэння Нацыянальнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях, якое прайшло ў Доме прафсаюзаў.

— Сёлета мы ўжо двойчы павышалі тарыфную стаўку першага разраду — у студзені і ў красавіку. Дзякуючы гэтаму сярэдняя зарплата работнікаў бюджэтнай сферы ў маі дасягнула 3,704 мільёна рублёў. А сярэдні заробак па краіне ўжо наблізіўся да адзнакі ў пяць мільёнаў. Каб крыху скараціць разрыў, і было прынята гэтае рашэнне, — патлумачыў **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандр РУМАК**. — Сярод іншага, у наступным годзе мы плануем накіраваць на павышэнне зарплат бюджэтнікаў і тыя сродкі, якія былі атрыманы ў выніку аптымізацыі дзяржаўнага сектара.

Прыйдуць змены і ў сістэму аказання адраснай дапамогі. 115 тысяч чалавек атрымалі ў яе рамках ад пачатку года 191 мільярд рублёў. Што і казаць, грошы для бюджэту вялікія. Аднак некаторыя грамадзяне паступова прывыкаюць да дзяржаўных дапамог і зусім не імкнуцца зарабляць на хлеб самастойна, фактычна ператвараючыся ва ўтрыманцаў. Таму Міністэрства працы і сацыяльнай абароны падрыхтавала праект указа, што абмяжоўвае падставы для выплаты штомесячнай дапамогі працаздольным людзям, якія адносіліся да катэгорыі занятых менш за шэсць месяцаў да даты звароту. Зрэшты, гэта будзе адносіцца і да хранічных беспрацоўных, якія адмаўляюцца ад працаўладкавання ці навучання азам новай прафесіі.

Рэформы закрануць і нядаўна зацверджаны ўрадам новы парадак аплаты бальнічных лістоў. Згодна з пастановай Савета Міністраў, першыя дванаццаць дзён непрацаздольнасці зараз аплачваюцца на 80%, а поўны заробак налічваецца толькі пасля гэтага тэрміну. Аднак такую сістэму моцна крытыкуюць прафсаюзы.

— Я не разумею, што ж такога здарылася ў грамадстве, што ў хворага чалавека трэба адняць дваццаць працэнтаў заробку? — заявіў **старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Леанід КОЗІК**. — Мы ні ў якім разе не выступаем супраць гэтых новаўвядзенняў, калі чалавек страціў працаздольнасць па сваёй віне, напрыклад, у стане алкагольнага ці наркатычнага ап'янення. Аднак калі зімой на прадпрыемстве быў парушаны тэмпературны рэжым і работнік захварэў менавіта з-за гэтага, то ў чым ён вінаваты?

У сваю чаргу, **першы віцэ-прэм'ер краіны Уладзімір Сямашка** запэўніў, што да канца наступнага тыдня ўрад правядзе неабходныя кансультацыі па гэтым пытанні. Пасля іх нашумелую пастанову скарэктуюць альбо ўвогуле адменяць.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

«ЖОРСТКІ» ДЭФІЦЫТ ЗДЫМНАГА ЖЫЛЛЯ ЎЗВІНЦІЎ ЦЭНЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Гэта могуць быць кватэры з мэбляй, са старой мэбляй ці часткова з ёй, або ўвогуле без нічога. Ва ўсіх гэтых выпадках гаспадары жылля адшукаюць сабе кліентаў. Зараз ідзе барацьба не за кліентаў, якія даюць грошы, а за жыллё.

А вось менавіта свабоднага жылля ў Мінску і не хапае. У дзень да спецыялістаў агенцтва нерухомасці «ПАКАДАН» трапляюць толькі 1—2 новыя кватэры па зразумелым невялікім кошце. Амаль імгненна такое жыллё і здаецца, бо попыт на здымныя кватэры зараз перавышае прапанову ў разы.

Крыху лепшыя па якасці аднапакаёвыя кватэры прапануюцца кліентам ужо па цэнніку ў дыяпазоне ад 440 да 480 і нават да 500 долараў. З такім цэннікам кватэры маюць ужо адносна сучасную мэблю, там ёсць пральная машына і іншая бытавая тэхніка.

У гэтым дыяпазоне цэн здаюцца сярэднія па якасці аднапакаёўкі каля буйных гандлёвых комплексаў і побач з метро. Але і падобных кватэр бізнес-класа ўжо не хапае. У дзень новага паступлення такога жылля зрэдку бывае больш за 3—4 кватэры.

Маленькія кватэры ў цэнтры і аднапакаёвае элітнае жыллё мае цэннік ад 520 да 800 долараў.

НЕ ХАПАЕ І ДВУХПАКАЁВЫХ КВАТЭР

Мінімальны кошт двухпакаёвых кватэр у трэцяй дэкадзе ліпеня дасягае 420—450 долараў плюс аплата камунальных паслуг. Бываюць, праўда, і двухпакаёўкі за 380—400 долараў, але гэта ўжо жылыя памяшканні з параметрамі ніжэй за сярэдні ўзровень якасці, або ў тых выпадках, калі вам сапраўды пашанцуе.

Цяпер кватэр з коштам арэнды да 450 долараў таксама не хапае, бо штодзённая прапанова падобнага жылля складае не больш чым 4—5 жылых памяшканняў. Крыху лепшыя па камплектацыі і рамонце двухпакаёўкі прапануюцца ўжо за 500 долараў. Сапраўды ўпакаваныя мэбляй і бытавой тэхнікай двухпакаёвыя кватэры, што знаходзяцца побач з лініяй метро, маюць цэннік ад 600 да 700 долараў. Зразумела, што здымаць такія «залатыя» кватэры могуць далёка не ўсе патэнцыяльныя кватаранты.

Попыт на трохпакаёвыя кватэры зараз не вельмі вялікі. Сярэдні кошт арэнды шматпакаёвак складае зараз каля 500—600 долараў. Часам магчыма адшукаць нават крыху таннейшую трохпакаёўку за 450—480 долараў, аднак тут ёсць адно «але»... Звычайна па такім кошце здаюць шматпакаёўкі вялікіх плошчаў у новабудоўлях, дзе ў кватэры зарэгістраваны максімум адзін чалавек. А гэта значыць, што камунальная плата такога жылля зімой будзе зашкальваць.

ПАТРАБАВАННІ ДА КВАТАРАНТАЎ СТАЛІ БОЛЬШ ЖОРСТКІМІ

Заяў на арэнду недарагіх кватэр цяпер у агенцтвах нерухомасці стала даволі шмат. Хто гэтыя кліенты? Не, гэта яшчэ не студэнты, хваля якіх чакаецца прыкладна праз месяц. Сёння кватэры арандуюць маладыя сем'і, якія вырашылі жыць асобна ад бацькоў; маладыя спецыялісты, што атрымалі перспектыўную працу ў сталіцы і... актыўныя маладыя людзі, якія маюць добрыя заробкі. Апошнія раней здымалі асобныя пакойчыкі, а зараз яны «кучкуюцца» па некалькі чалавек і здымаюць ужо асобнае жыллё. Гэта рэальная катэгорыя кватэранаймальнікаў, якая не заўсёды задавальняе кватэраздатчыкаў.

Сёлета гаспадары арэндных кватэр сталі больш патрабавальна ставіцца да выбару будучых кватарантаў. Амаль усе гаспадары жадаюць, каб гэта абавязкова была сям'я без малых дзяцей (ці ўвогуле без дзяцей) і без жывёл. Узнікаюць парадаксальныя сітуацыі, калі гаспадар кватэры паведамляе аб тым, што побач з яго домам ёсць дзіцячы садок і школа, а потым патрабуе, каб у кватарантаў не было дзяцей. Дзіўная сітуацыя...

Спадарыня Лукашэвіч паведамляе, што часам сярод гаспадароў здымных кватэр пачынаюць гуляць зусім незразумелыя чуткі. Напрыклад, што калі сям'ю з малым дзіцем афіцыйна аформіць па дагаворы ЖЭСа, то потым узнікнуць пэўныя праблемы з іх магчымым высяленнем нават тады, калі кватаранты не будуць плаціць за арэнду. Такія чуткі не маюць пад сабой ніякай глебы, лічыць Аксана Лукашэвіч. Цяпер у большасці выпадкаў у кватарантаў патрабуюць даведку аб сярэдніх заробках, а ў асобных выпадках — і пашпарт, каб даведацца, што шлюб гэтай сям'і сапраўды зарэгістраваны.

Узнікаюць парадаксальныя сітуацыі, калі гаспадар кватэры паведамляе аб тым, што побач з яго домам ёсць дзіцячы садок і школа, а потым патрабуе, каб у кватарантаў не было дзяцей. Дзіўная сітуацыя...

Аксана Лукашэвіч прагназуе чарговую хвалю ажыятажнага попыту на здымныя кватэры ў трэцяй дэкадзе жніўня і ў верасні. Магчыма, што тады сярэднія цэны арэнды бюджэтных кватэр павялічацца яшчэ на 50—100 долараў.

НОВЫ ТРЭНД НА КАМПАНЬЁНСТВА

За апошні час павялічыўся кошт арэнды і асобных пакойчыкаў у звычайных кватэрах. Сёння асобны пакой у кватэры разам з гаспадарамі каштуе ад 140 да 160 долараў. Можна зняць пакой у кватэры, якую ўжо здымае нейкі грамадзянін. У гэтым выпадку арэндная плата ўсёй кватэры дзеліцца напалову і кошт пакойчыка без гаспадароў будзе ўжо да 250 долараў. Пры арэндзе шматпакаёвых кватэр сістэма кампаньёнства выкарыстоўваецца ўсё часцей студэнтамі. Галоўнае, каб гаспадары жылля былі не супраць таго, калі з іх кватэры арганізуюць інтэрнат.

ПРАБЛЕМА ДЭФІЦЫТУ ЗДЫМНАГА ЖЫЛЛЯ ПРАЦЯГНЕЦЦА НА ГАДЫ

Аксана Лукашэвіч упэўнена, што сур'ёзны недахоп аб'ектаў прыватнай жыллёвай арэнды будзе назірацца ў Мінску ад 2 да 5 гадоў. І гэта пры ўмове, што ў бліжэйшы час у сталіцы будзе весціся масавае будаўніцтва новых жылых кварталаў.

Нават масавае будаўніцтва арэндных дамоў сітуацыю ў прыватным сектары арэнды не выправіць. Справа ў тым, што арэндныя кватэры размяркоўваюцца толькі сярод чаргавікоў або тых спецыялістаў, якія патрэбны гораду. Добра, калі арэндныя дамы знімуць вострую праблему сярод чаргавікоў праз 10—15 гадоў, лічыць наш эксперт.

Калі закрануць бліжэйшую перспектыву з арэндай, то і яна не радуе. Аксана Лукашэвіч прагназуе чарговую хвалю ажыятажнага попыту на здымныя кватэры ў трэцяй дэкадзе жніўня і ў верасні. Магчыма, што тады сярэднія цэны арэнды бюджэтных кватэр павялічацца яшчэ на 50—100 долараў. Гэтае падараванне справакуюць не толькі студэнты і маладыя спецыялісты пасля ВНУ, але і новыя работнікі буйных супермаркетаў Мінска, упэўнена Аксана Лукашэвіч.

Сяргей КУРКАЧ.

УЛАСНАЯ ДУМКА

Не трэба быць занадта сквапнымі

Так здарылася, што ў свой час карэспандэнт «Звязды» сам на працягу 13 гадоў здымаў кватэру. Кошты на арэнду тады былі зусім іншыя — ад 60 да 120 долараў.

Мне заўсёды шанцавала з гаспадарамі, якія павялічвалі цэннік толькі праз даволі працяглы час і не вельмі моцна. Сёння мой знаёмы здае двухпакаёўку без мэблі ў новым мікрараёне за 350 долараў. Цэннік арэнды на такое жыллё ў Мінску сёння ўжо істотна павялічыўся, але мой таварыш вырашыў быць чалавекам і кошт не мяняць. Ён лічыць, што ў першую чаргу трэба мець паразуменне са сваім сумленнем, што трэба ўлічваць інтарэсы і праблемы іншых людзей. Нельга ўсё вымяраць грашыма, якія зарабляюцца не працай, а на штучным ажыятажы. Я падтрымліваю яго пазіцыю «на ўсе 100».

А яшчэ мяне абурае той факт, што вялікая колькасць кватэраздатчыкаў займаецца прыватнай арэндай па шэрай схеме і падаткі не плаціць. Тут я нагадаю, што сёлета падатковыя органы арганізавалі амаль 500 праверак па лініі здымнага жылля. Пасля чаго ў бюджэт дадаткова паступіла 283,6 млн рублёў. З пачатку года да 1 ліпеня на ўліку ў інспекцыях Мінска ў якасці кватэраздатчыкаў зафіксавана 40488 падаткаплацельшчыкаў, што на 5184 чалавекі больш, чым за падобны перыяд летась.

Сяргей ПАЛІНІН.

НАВІНЫ

БПЦ АБНАРОДАВАЛА ПРАГРАМУ ЗНАХОДЖАННЯ КРЫЖА АПОСТАЛА АНДРЭЯ Ў МІНСКУ

28 ліпеня ў 23.45 дэлегацыя Эладскай праваслаўнай царквы дастаўляе Андрэеўскі крыж у Мінск на цягніку, пасля чаго святыня прыбудзе ў храм Андрэя Першазванага (вуліца Малініна, 19), дзе будзе знаходзіцца да 7.30. На другі дзень, 29 ліпеня, да 8.00 крыж будзе перанесены ў цэнтр Мінска на Замчышча, да месца літургіі, якую адслужыць Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Кірыл разам з кіраўнікамі і прадстаўнікамі іншых памесных цэркваў. Пасля богаслужэння крыж апостала Андрэя будзе дастаўлены ў прыход Усіх Святых (перакрыжаванне вуліц Каліноўскага і Усіхсвяцкай, станцыя метро «Усход»), дзе застанецца да 2 жніўня. Доступ да святыні будзе кругласутачным.

БЕЛТА.

БЕЛАРУСЬ ПРЫНЯЛА ЎСЕ НЕАБХОДНЫЯ МЕРЫ ПА НЕДАПУШЧЭННІ РАСПАЎСЮДЖВАННЯ АЧС

Аб гэтым заявіў журналістам кіраўнік прадстаўніцтва Міжнароднага эпізаатычнага бюро па Усходняй Еўропе Казімірас Лукаўскас, перадае карэспандэнт БелТА.

«Беларусь — гэта прыклад таго, як трэба рэагаваць і працаваць у такой сітуацыі. Мы бачым вельмі вялікія намаганні з боку беларускага ўрада і Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, робіцца вельмі шмат, — адзначыў Казімірас Лукаўскас. — Мы хочам пераняць вопыт Беларусі па барацьбе з афрыканскай чумой свіней і прапаноўваць яго іншым краінам».

Кіраўнік прадстаўніцтва Міжнароднага эпізаатычнага бюро падкрэсліў, што ў краінах, дзе выяўлены ачагі захворвання, у першую чаргу неабходна арганізаваць біябяспеку. «Ферма, дзе знаходзяцца свінні, павінна быць агароджана і закрыта. Ніхто з пабочных асоб не павінен туды пранікнуць», — растлумачыў ён.

Казімірас Лукаўскас прымаў удзел у сустрэчы кіраўнікоў ветэрынарных службаў Беларусі, Расіі і Украіны па выпрацоўцы сумесных мер барацьбы з афрыканскай чумой свіней.

ПАДЗЕІ

КАНФІСКАВАНЫ МАТАЦЫКЛЫ НА 392 МІЛЬЁНЫ

Дзякуючы пільнасці беларускіх мытнікаў, канфіскавана пяць матацыклаў вядомых брэндаў агульным коштам больш як 392 мільёны рублёў.

— Скончана праверка па факце ўвозу праз рэспубліканскі пункт мытнага афармлення «Урбаны» на тэрыторыю Мытнага саюза грамадзянінам Расіі васьмі новых матацыклаў. «KAWASAKI KXF450», «SUZUKI RMZ250», «KTM SX50», «KTM SX65» — гэтыя матацыклы былі выраблены ў 2012-2013 гадах.

У ходзе праверкі высветлена, што з мэтай бяспошліннага ўвозу гэтых матацыклаў грамадзянінам Расіі ў беларускі мытны орган была пададзена несапраўдная дэкларацыя Себежскай мытні (расійскай. — **Аўт.**) без нумара, якая змяшчае звесткі аб тым, што ўсе матацыклы, якія ён увозіў, вывозіліся з тэрыторыі Мытнага саюза — з Расійскай Федэрацыі ў Латвію. Фактычна з тэрыторыі Мытнага саюза грамадзянінам вывозіліся толькі тры матацыклы, — паведамілі ў аддзеле ідэалагічнай працы Віцебскай таможні.

У сувязі з чым 5 матацыклаў канфіскавалі. Па гэтым факце праводзіцца далейшая праверка.

ДЫРЭКТАР ГАСПАДАРКІ... БЕЗ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ

У Сенненскім раёне вызвалены ад займаемай пасады дырэктар сельскагаспадарчага прадпрыемства, які кіраваў гаспадаркай, не маючы нават агульнай сярэдняй адукацыі. Адбылося гэта пасля адпаведнага прадстаўлення пракурора. Аказалася, што цяпер ужо былы кіраўнік быў прызначаны на сваю пасаду з улікам прадстаўленых дакументаў аб адукацыі (у тым ліку аб вышэйшай), якія не адпавядалі рэчаіснасці.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ФАКТЫ

■ Уборачная-2013

УРАДЖАЙНАСЦЬ ЗМЕНШЫЦЦА ДА 31 ЦЭНТНЕРА З ГЕКТАРА?

Менавіта такую лічбу прагназуюць спецыялісты Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання. Летась сярэдняя ўраджайнасць па рэспубліцы склала 38 ц/га. Памяншэнне абумоўлена шэрагам аб'ектыўных прычын, сярод якіх — празмерна доўгая зіма, што сёлета была ў Беларусі. У асобных рэгіёнах снег не сыходзіў больш за 140 дзён, у той час як стандартны перыяд супакою складае 90 дзён. Гэтую інфармацыю журналістам паведаміў намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Васіль ПАЎЛОЎСКІ.

Нягледзячы на дажджлівае надвор'е, па краіне ўбрана ўжо больш за 9% пасеваў. У лідарах — паўднёвыя рэгіёны, дзе пакуль што больш суха. Васіль ПАЎЛОЎСКІ падкрэсліў, што ў плане наяўнасці і гатоўнасці тэхнікі, фінансавання работ, забеспячэння паліўна-змазачнымі матэрыяламі, колькасці механізатараў асаблівых праблем падчас сёлетняй уборкі няма.

Пры добрым надвор'і і 10-гадзінным працоўным дні ў гэтым годзе тэмпы ўборкі могуць дасягнуць паказчыка ў 150 тысяч гектараў у дзень. Летась на піку ўборачнай ён быў на 23 тысячы меншым. Усё пры тых жа ўмовах увесь ураджай можа быць сабраны за 21 працоўны дзень.

Па словах намесніка міністра, некаторыя культуры, першапачаткова засеяныя пад корм, могуць быць ўбраны на зерне. Гэта тычыцца, напрыклад, яравога ячменю і кукурузы, якія ў некаторых рэгіёнах ужо выспелі да патрэбнага ўзроўню. Гэта дазволіць павысіць паказчык сярэдняй ураджайнасці яшчэ на 3-4 ц/га і ў выніку сабраць 9,2-9,4 мільёна тон зерня. Для своечасовай уборкі зерневых дадаткова прыцягнуты 4 тысячы механізатараў. Агульная ж колькасць камбайнераў і вадзіцеляў складае 20,4 тысячы чалавек. На закупку зерневых па дзяржзаказе выдзелена 6,3 трыльёна рублёў.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.

■ Погляд

ЕЎРАБЮРАКРАТЫЯ ПА-ЛІТОЎСКУ

Некалькі дзён таму міністр замежных спраў і міністр навакольнага асяроддзя Літвы зрабілі даволі жорсткія заявы, якія тычацца ходу беларуска-літоўскіх перамоў па пытанні будаўніцтва беларускай АЭС.

Міністр навакольнага асяроддзя Валянцінас Мазуроніс заявіў літоўскаму агенцтву BNS, што «ў дасланых раней адказах Беларусі па Астравецкай АЭС мы бачым шмат пытанняў, якія засталіся без адказу. МЗС даручана перадаць нашу пазіцыю Беларусі, і пакуль няма канчатковых, поўных адказаў, сустрэчы з грамадскасцю не могуць праводзіцца».

Гаворка ідзе пра тое, што, у адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі (напрыклад, Канвенцыяй Эспа), краіна паходжання трансгранічнага ўздзеяння на навакольнае асяроддзе абавязана паведаміць суседнім краінам пра дзейнасць, якая падобнае ўздзеянне акажа (у нашым выпадку — пра будаўніцтва і далейшую працу АЭС). З заявы літоўскага міністра вынікае, што Беларусь не падала Вільнюсу поўных адказаў на адпаведныя пытанні.

У гэтым жа духу выказаўся кіраўнік МЗС суседняй краіны, які абвінаваціў Беларусь у невыкананні працэдур Канвенцыі Эспа. «Тое, што яны даслалі, не адпавядае патрабаванням да даных, і такія сустрэчы [з грамадскасцю Літвы] не могуць праводзіцца», — сказаў міністр Лінас Лінкявічус.

Тут узнікае пытанне: чаму для інфармавання беларускага боку аб нібыта недастатковасці пададзенай ёй інфармацыі літоўскія чыноўнікі выбралі літоўскае ж інфармагенцтва, а не звычайную міжведамасную перапіску?

Бо, як нам стала вядома ад крыніц у Міністэрстве замежных спраў Беларусі, усе, менавіта ўсе (!) матэрыялы па ўсіх пытаннях літоўскага боку беларускія ведамствы далі яшчэ ў 2012 годзе, у тым ліку — перакладзенымі на літоўскую мову. І з тых часоў — у адказ ні слоўца. Больш за тое, інфармацыю па ўсіх асноўных пытаннях, прадугледжаных Канвенцыяй Эспа, Беларусь дала яшчэ раней. Але на працягу 2012 года ў літоўскіх калег узнікалі ўсё новыя і новыя пытанні, на якія беларускія ведамствы цярпліва накіроўвалі адказы. На працягу 2013 года 5 разоў (!) Мінск афіцыйна звяртаўся да Вільнюса з просьбай даць адказ на накіраваныя матэрыялы і запрашаў літоўскіх калег да пачатку грамадскіх абмеркаванняў трансгранічнай ацэнкі па ўздзеянні на навакольнае асяроддзе (АУНА) беларускай АЭС. Адказ жа прыйшоў толькі 8 ліпеня 2013 года, калі Вільнюс паведаміў, што паперы ўсё ж такі атрыманы, што яны вывучаюцца і што папярэдні адказ на іх можа быць дадзены не раней канца лета 2013 года. Пры гэтым у вусных перамовах было сказана, што з-за вялікай занятасці ў сувязі са старшынствам Літвы ў ЕС разгляд беларускіх дакументаў зацягваецца.

Іншымі словамі, літоўскі бок проста паклаў паперы ў стол і зацягвае пытанне. Пры гэтым ім парушаюцца палажэнні той самай Канвенцыі Эспа, якая абвяшчае, што «зацікаўленыя Бакі забяспечваюць распаўсюджванне адпаведнай дакументацыі сярод органаў і грамадскасці зацікаўленага Боку ... , а таксама прадстаўленне заўваг кампетэнтнаму органу Боку паходжання, альбо непасрэдна, альбо, калі гэта неабходна, праз Бок паходжання, у разумныя тэрміны да прыняцця канчатковага рашэння датычна запланаванай дзейнасці».

Навошта гэта літоўскаму боку трэба — прыкладна зразумела. Літоўскае МЗС нядаўна заявіла, што ад планаў па будаўніцтве ў самой Літве новай, Вісагінскай АЭС яшчэ ніхто не адмаўляецца і перамовы з японскай кампаніяй Hitachi, якая павінна будзе будаваць літоўскі рэактар, яшчэ працягваюцца (вось ужо які год). Але калі ў рэгіёне з'явіцца Балтыйская АЭС у Калінінградскай вобласці і Беларуская АЭС у Гродзенскай вобласці, будаўніцтва новай літоўскай АЭС будзе ўжо эканамічна немэтазгодным. Таму МЗС нашых суседзяў стараецца як мага даўжэй «цягнуць ката за хвост» у жаданні затармазіць беларускі праект. Дарэчы, у дачыненні да Балтыйскай АЭС Вільнюсам былі прыняты яшчэ больш жорсткія меры, звязаныя з адмовай купляць у будучыні электраэнергію, што выкрабляецца на ёй.

Аднак з атамнымі амбіцыямі знешнепалітычнага ведамства Літвы не вельмі згодна насельніцтва краіны, якое на нядаўнім рэферэндуме большасцю галасоў (больш за 60%) выказалася супраць будаўніцтва ў краіне атамнай электрастанцыі. Вынік гэты вымушана была прызнаць легітымным прэзідэнт Літвы Даля Грыбаўскайтэ, хоць яна і ўбачыла ў ім «руку Масквы» (папулярны ў апошні час лозунг). Аднак міністра замежных спраў гэта чамусьці не пераканала, ён вырашыў ратаваць праект Вісагінскай АЭС насуперак волі народа (дарэчы, таксама папулярны ў апошні час падыход у еўрапейскай палітыцы).

Будучы юрыстам-міжнароднікам па адукацыі і памятаючы пра няўхільны прынцып добрасумленнага выканання абавязацельстваў, я, шчыра сказаць, быў абураны такімі паводзінамі літоўскіх чыноўнікаў. Але расійскі калега, **кіраўнік Руска-Балтыйскага медыя-цэнтра Ігар ПАЎЛОЎСКІ** *(на фота)* падказаў, што здзіўляцца і абурацца тут якраз няма чаму:

«Гэта тактыка літоўскага боку ўжо была адпрацавана на Балтыйскай АЭС. Абсалютна такое ж жаданне «забалбатаць» тэму, пастаянна абвінавачваючы другі бок у неіснуючых грахах. Адмова ад канструктыўнага дыялогу, галаслоўныя асуджэнні, пастаянная віртуальная апеляцыя да нейкіх «еўрапейскіх стандартаў і каштоўнасцяў» замест сур'ёзнай размовы аб бяспецы — яркія адметныя крокі такой тактыкі. Беларусі трэба рыхтавацца да таго, што на ўсе прапановы правесці канструктыўныя размовы будзе абсалютна істэрычная рэакцыя з літоўскага боку. Адрозненне Расіі ад Беларусі толькі ў адным, што Расія на момант пачатку будаўніцтва не ратыфікавала Канвенцыю Эспа, таму можа спакойна будаваць АЭС, не звяртаючы ўвагі на незадаволенасць Літвы».

Таму зусім карэктным у такой сітуацыі выглядае рашэнне беларускіх улад у ініцыятыўным парадку прызначыць грамадскія абмеркаванні на падставе канчатковай справаздачы аб АУНА беларускай АЭС 17 жніўня 2013 года ў г. Астраўцы з запрашэннем туды літоўскай грамадскасці. Як нам паведамілі ў Міністэрстве замежных спраў Беларусі, беларускі бок гатовы прыняць да тысячы літоўцаў, прадаставіць ахвотным бясплатныя візы, арганізаваць транспартнае забеспячэнне іх удзелу ў абмеркаваннях. Пасля гэтага мерапрыемства беларускі бок запрашае кампетэнтных літоўскіх прадстаўнікоў на экспертнае абмеркаванне АУНА ў Мінску 20 жніўня 2013.

Мабыць, такі спакойны і карэктны падыход з'яўляецца адзіна правільным у гэтай сітуацыі. Абавязацельствы па міжнародных пагадненнях падлягаюць безумоўнаму выкананню.

Юрый ЦАРЫК, палітычны аналітык, кіраўнік Беларускай групы развіцця.

■ На слыху

КАЛЯ ДОКШЫЦ ЗЛАВІЛІ... ЧУПАКАБРУ?

21 ліпеня на выгане ля аграгарадка Пруднікі Докшыцкага раёна працаўнікі малочна-таварнай фермы забілі невядомую жывёлу, — паведамляюць мясцовыя СМІ. — Яна кідалася на кароў і цялят, кусала іх за ногі. Яшчэ дзве, большыя па памеры, жывёліны паспелі ўцячы. Забітую істоту забраў на тэрыторыю ветэрынарнай станцыі галоўны ветурач раёна Алесь Салаўёў.

фота Krajby

Вызначыць від жывёлы не змог ні сам ветэрынар, ні паляўнічыя. Пры гэтым Алесь Салаўёў не ўбачыў ніякай сенсацыі ў знаходжанні такога віду і ўжо спаліў труп.

Паляўніцтвазнаўца мясцовай структуры Таварыства паляўнічых і рыбаловаў, які бачыў забітую істоту, мяркуе, што гэта мутант: «Цяжка сказаць, што б гэта магло быць. Думаю, мутант нейкага віду. Для мяне дык на гіену падобна. Нешта ў ім лісінае, нешта ад янота, нешта ад сабакі».

Па многіх прыкметах істота вельмі падобная да легендарнай чупакабры — невядомай навуцы жывёлы, якая быццам бы нападае на капытных і выпівае з іх усю кроў. Першыя паведамленні пра чупакабру з'явіліся ў 1950-я гады ў Пуэрта-Рыка. Пасля гэтага такія паведамленні пачалі з'яўляцца па ўсім свеце: у Аргенціне, Балівіі, Гандурасе, ЗША, Калумбіі, Чылі і нават у Расіі і ва Украіне. Звычайна за «чупакабру» прымалі мутантаў або змучаных хваробай жывёл іншых відаў.

Дарэчы, гэтая «чупакабра» ў Беларусі таксама не першая. У 2011 годзе непадалёк ад Ліды грыбнікі прынялі за яе... труп звычайнай лісіцы.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.

У «ЧУПАКАБРЫ» ВУЧОНЫЯ АПАЗНАЛІ ЯНОТАПАДОБНАГА САБАКУ?

Невядомая жывёла, забітая ў Докшыцкім раёне, мае ўсе прыкметы маладога янотападобнага сабакі, паведаміў карэспандэнту БелТА загадчык сектара міжнароднага супрацоўніцтва і навуковага суправаджэння прыродаахоўных канвенцый Дзяржаўнага навукова-вытворчага аб'яднання «Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па біярэсурсах» кандыдат біялагічных навук Аляксандр Казулін.

Фотаздымак невядомай жывёлы, забітай на пашы каля аграгарадка Пруднікі, распаўсюдзілі ў інтэрнэце беларускія СМІ. Звер нападаў на кароў і цялят.

Аляксандр Казулін лічыць, што забіты звер падобны на маладога янотападобнага сабаку. Гэтыя жывёлы нараджаюцца лысымі, поўсцю яны абрастаюць па меры сталення. Верагодна, забітай асобіне не было і года. «Без аховы з шэрсці звер не змог бы выжыць зімой», — дадаў вучоны.

Аднак здзіўляе, што янотападобны сабака раптам стаў нападаць на кароў і цялят, адзначыў Аляксандр Казулін. Па спосабе збору корму янотападобны сабака — тыповы збіральнік, які харчуецца жывёльнай і раслінай ежай (гэта ў асноўным апалыя плады, ягады). Янотападобны сабака есць мышэй, птушак, жукоў. Нападаць на больш буйных жывёл звер не рызыкуе.

Радзіма янотападобнага сабакі — Усходняя Азія. У 1936 годзе ў Беларусь завезена каля 100 асобін гэтага віду. З той пары колькасць янотападобнага сабакі павялічылася ў шмат разоў. У Беларусі жывёла лічыцца інвазіўным відам.

БЕЛТА.

Станіслаў ЛІПСКІ:

«ЛЮБОЎ ДА СПОРТУ МНЕ НА ГЕННЫМ УЗРОЎНІ ПЕРАДАЛАСЯ»

Спартыўная драма — яго любімы жанр у кіно, а па жыцці спорт — лепшыя лекі і выратаванне. Станіслаў Ліпскі — прыклад таго чалавека, які калі ставіць мэту перад сабой, то робіць усё патрэбнае, каб дасягнуць яе. Галоўнае — займацца любімай справай і развівацца ў сваёй вобласці. Год таму гэты юнак пакінуў перспектыўную працу на заводзе і прыйшоў на тэлебачанне, бо толькі яно магло наблізіць яго да здзяйснення мары. Ужо вядомы гледачам, як карэспандэнт «Навін рэгіёна» і рубрыкі «Матчбол», цяпер Стас прымерае на сябе амплуа вядучага спартыўных навін.

— Ведаеш, я раней летам адпачываў у бабулі, і яна выпісвала вашу газету. Там была спартыўная калонка. Таму кожны раз, як толькі прыходзіла газета, я глядзеў спартыўныя навіны. Часам яшчэ і бабуля нешта рэкамендавала пачытаць.

— Мабыць, і іншыя ўспаміны засталіся пра тыя часы?

— Я нарадзіўся ў Маскве, потым мы пераехалі ў Жлобін. Па вялікім рахунку, у мяне няма такога месца, якое я мог бы назваць сваёй радзімай. Жлобін — гэта месца, дзе я рос, выхоўваўся, але менавіта Сасновы бор у Светлагорскім раёне, дзе жыве мая бабуля, — найбольш дарагое месца для мяне. Мне дастаткова хоць пару дзён там пабыць, каб адчуць гармонію. Я нават год правучыўся ў той мясцовасці. Аднак, улічваючы тое, што ў мяне алергія на многія рэчы, кожны прыезд у вёску — сапраўднае выпрабаванне летам. Але там быў футбол. Я лічу, што гэта быў лепшы калектыў як у дзіцячым, юнацкім, так і ў дарослым футболе. Падчас гульні мы разумелі адзін аднаго без слоў. Сустракаліся а дзясятай гадзіне раніцы і насіліся да сямі вечара. Раніцай я стараўся нешта бабулі дапамагчы па хатніх справах, бо потым мяне чакала гульня. На адной з іх я сказаў свайму сябру Эдварду: «Ведаеш, мы павінны стаць спартыўнымі каментатарамі ці працаваць недзе ў гэтай сферы». Сябар займаецца сёння праграмным забеспячэннем, а я вось наблізіўся да спорту.

— Адчуваеш хваляванне ад таго, што ты цяпер вядучы спартыўных навін?

— Зараз яшчэ не адчуваю хвалявання, бо не да канца веру, што ўсё адбываецца са мной. Я ўдзячны нябёсам, што наблізіўся да сваёй мары. Магчыма, аднойчы я і каментатарам стану, а пакуль буду расказваць людзям пра спорт. Заўсёды радаваўся любой магчымасці пагаварыць на гэтую тэму, і вось яна з'явілася.

— Раскажы аб камандзе, у якой ты працаваў на тэлебачанні дагэтуль...

— На тэлебачанне я прыйшоў «з вуліцы» якраз год таму. І за гэты час мяне на канале вырасцілі. Былі людзі, якія маглі сказаць, што тут відэа не так напісана, а замест аднаго пытання было б лепш задаць іншае. Прафесійны стрыжань ва мне выпрацаваўся дзякуючы майму былому кіраўніку Вользе Шпілеўскай, калезе Юліі Аляксандравай, якая прывяла мяне ў спартыўны аддзел, калі ім патрэбна была дапамога на мінулай Алімпіядзе. Тады мяне пасадзілі і сказалі: «Шукай, пішы!» Але да гэтага была Аксана Шыдлоўская, з якой я паехаў на свае першыя здымкі, як практыкант-пачаткоўца. Тады яна яшчэ расказала, што заўважыла заканамернасць: усе, хто едзе на здымкі першага сюжэта з ёю, потым знаходзяць свой шлях на тэлебачанні. Для мяне яна настаўнік, татэм і сябра, да якога заўсёды магу звярнуцца з любым пытаннем. Нядаўна мы вярнуліся да таго першага эпізоду, калі зноў разам ехалі рабіць сюжэт і, як паказаў час, — правіла працуе. Насамрэч можна многіх людзей называць: Ганну Ялфімаву, Мікалая Стула, Андрэя Іванова — кожны з іх даваў нешта сваё, каб у мяне ўсё атрымалася.

Рабочы момант: інтэрв'ю з Максімам Мірным.

Навіна — яна ж ці праблема ў аснове сваёй, ці радасць, ці яшчэ нешта, і трэба перадаваць такія адценні адпаведна. Іначай падзеі ўспрымуць як інфармацыю, не больш.

— Адкуль у цябе такі інтарэс да спартыўнай тэматыкі?

— Ён, магчыма, мне на генным узроўні перадаўся. Я гадоў з сямі памятаю, як дзед глядзеў футбольныя матчы па тэлевізары. Маці была баскетбалісткай у школе, займалася лёгкай атлетыкай, гуляла ў валейбол. Нават зараз яна глядзіць хакей, ведае гульцоў, схемы ігры, прозвішчы трэнераў. Мама заўсёды была прыхільніцай таго, што спорт загартоўвае і дапамагае характар выпрацаваць. З часам я і сам пайшоў у валейбольную школу, хоць больш любіў футбол. У Жлобіне гуляў у валейбольнай камандзе дублёраў. Пры гэтым паспяваў і вучыцца добра, і кнігі чытаць. Але, калі нешта ў жыцці не атрымлівалася, я шукаў паратунку ў спорце. Там жа галы, драматызм — задавальненне, якога больш нідзе не знойдзеш... Спартыўная драма наогул мой любімы жанр у кіно. Нядаўна нават злавіў сябе на думцы, што адна з маіх мэт — зняць фільм у гэтым жанры.

— Што падштурхнула цябе да жадання кардынальна змяніць сваё жыццё?

— Я працаваў на заводзе, займаўся металургіяй, але марыў аб спорце. Калі б не мінулыя траўмы спіны, то займаўся б ім прафесійна. А так, як я займаюся ім зараз, — мая адзіная магчымасць пакуль што заставацца ў тэме. Вырашыў паспрабаваць і прыйшоў у Бэлтэлерадыёкампанію. Колькі сябе памятаю, усе спартыўныя трансляцыі ладзілі тут. Спачатку мяне ўзялі ў рэгіянальныя навіны карэспандэнтам. Я разумеў, што займацца давядзецца рознымі тэмамі. Калі выдавалася магчымасць рабіць нешта на тэму спорту, то радаваўся. Увесь час кантактаваў са спартыўным аддзелам, прыходзіў, каб паглядзець, што і як. Потым удалося ўзняцца на прыступку ў плане вопыту і прафесіяналізму. Галоўнае спрабаваць, тады ўсё атрымаецца.

— Якой была твая рэакцыя, калі першы раз пабачыў сябе на экране?

8.40, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
11.00 «Да суда».
11.55 «Суд прысяжных».
13.30 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
15.15 «Справа густу».
15.40, 18.30 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
16.25 «Пракурорская праверка».
17.35 «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
19.35 Серыял «Масква. Тры вакзалы».
21.25 Серыял «Марскія д'яблы».
0.00 Серыял «Глухар. Вяртанне».

8 КАНАЛ

7.00, 12.30, 18.35, 21.05, 23.45 «Надвор'е».
7.05 М/с «Ліга справядлівасці».
7.25, 14.30 Серыял «Эліза».
9.05, 17.45 Серыял «Дзённікі вампіра».
9.50 «Мой любімы гадаванец».
10.20, 18.40 Серыял «Пра слушка».
12.20 Баявік «Ліцэнзія на забойства».
16.00 Мультпарад.
16.30 «Адшукваецца адпачынак».
17.00 Серыял «Кампаньёны».
20.45 «Вечарніца».
21.10 Баявік «Трансформеры».

ВТБ

6.00, 1.00 «PLAY».
8.00, 14.00, 18.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
8.30, 17.30 «С.У.П.».
9.00 Серыял «Татавы дочкі. Нявесты».
10.00, 19.00 Серыял «Метад Лаўровай».
11.00, 22.20 Серыял «Маргоша».
12.00 Серыял «Дзённік доктара Зайцавай».
13.00, 16.30, 0.00 Скетч-шоу «Анекдоты».
13.30, 17.00, 20.00 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
14.30, 23.30 «Улётнае відэа».
15.00 Серыял «Кадэцтва».
16.00, 18.30, 0.30 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
21.10 Серыял «Галыгін. ru».

ІНТЭР+

7.00 Раніца з ІНТЭРам.
9.00 Музыка з Украіны.
9.10, 14.45, 4.00 Феерыя падарожжаў.
9.40 Серыял «Людзі і цені-2».
10.25, 17.30, 21.55 Дак. серыял «Галівудскія пары».
11.15 Серыял «Заручальны пярсцёнак».
12.00, 15.45, 23.40 Краіна смяецца.
12.15, 22.45 Рэчавы доказ.
12.45, 18.20, 5.10 Серыял «Анёл-ахоўнік».
13.30, 23.55 Пазавочы.
14.20, 23.15 Ілюзіі сучаснасці.
15.05, 0.45 Судовыя справы.
16.00 Серыял «Служба 21, або Думаць трэба пазітыўна».
16.45, 1.25 Сямейны суд.
19.10, 2.10 Дак. серыял «Украіна. Забытая гісторыя».
20.00, 3.00 Падрабязнасці.
20.30 Маст. фільм «Жалезнае поле».
3.30 Смартшоу.
4.25 Формула кахання.

НАСТАЛЬГІЯ

5.00, 23.00 «Канцэрт Яўгена Клячкіна». 1990 год.
6.10 «Вороне где-то Бог...». Дак. фільм.
6.40, 12.40, 18.40, 0.40 «Мяжа магчымага». Маст. фільм.
8.00, 14.00, 20.00, 2.00 «Час».
9.00, 15.00, 3.00 «Народжаныя ў СССР».
10.00, 16.00 «Праграма «А». 1989 год.
11.00, 17.00 «Ад усёй душы. Юбілейныя сустрэчы». 1977 год.
12.10 «Абавязковая праграма». Дак. фільм.
18.05 «Ранішняя пошта». 1983 год.
21.00 «Колба часу».
22.00 «Погляд». 1988 год.
0.20 «Музычная мазаіка». 1993 год.
4.00 Творчы вечар Ігара Крутога. 1994 год.

EUROSPORT

9.30, 11.00, 15.00, 18.30, 0.45 Плаванне. Чэмпіянат свету. Фіналы.
13.45 Футбол. Чэмпіянат Еўропы (U-19). Фінал.
16.30, 23.15 Чэмпіянат свету па водных відах спорту.
21.30 Скачкі на лыжах. Летні Гран-пры.
22.15 Самыя дужыя людзі планеты.
0.30 Sports excellence.
1.30 Веласпорт. Тур Польшчы.

КАМЕДЫЯ

5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05 «Паміж намі».
5.15, 8.00, 12.55, 16.00, 2.20 Серыял «Доўга і шчасліва».
6.15 Камедыя «Карсіканец».
8.35 Камедыя «Шафёр на адзін рэйс».
11.15 Камедыя «Скажы так».
13.45, 16.45, 21.45, 23.55, 3.10 «Камедыянты. Лепшае».
14.10 Камедыя «Сакрэт майго поспеху».
17.20 Мюзікл «Другі хор».
19.20 Камедыя «Лютыя ставрэнні».
21.00 Серыял «Бэт!». 1-я серыя.
22.10 Камедыя «Дурням закон не пісаны».
0.10 Камедыя «Шэф».
1.35 Камедыя «Паліцыя».
3.25 Камедыя «Памер мае значэнне».

ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

2.00, 8.00, 14.00 Маст. фільм «Старая крэпасць».
3.05, 9.05, 15.05 М/ф «Трое з Прастаквашына». Зборнік м/ф «Раз гарох, два — гарох...». «Драўляныя чалавечкі». «Чучала мяучала».
4.00, 10.00, 16.00 М/с «Вялікая энцыклапедыя прыроды». Казкі рускіх пісьменнікаў. «Тры таўстуны».
5.00, 11.00, 17.00 Маст. фільм «Прынц і жабрак». Казкі народаў свету. «Карантышказялёныя штонікі».
6.30, 12.30, 18.30 М/с «Легенда пра Зора».
7.00, 13.00, 19.00 «Урокі цётачкі Савы». Зборнік м/ф «Самавар Іван Іваныч». «Мы ідзём шукаць». «Кібітачка на адным коле».

ТБ3

6.00 М/ф.
9.00, 18.30, 2.50 Серыял «Фатмагуль».
10.45, 17.00 Дак. серыял «Паражбітка».
12.45, 18.00 Дак. серыял «Паляўнічыя на прывідаў».
13.15 Серыял «Апошняя сустрэча».
14.15 Серыял «Канцінуум».
15.05, 2.00 Серыял «Менталіст».
20.20, 4.20 Камедыя «Аднойчы ў Рыме».
22.15 Маст. фільм «Блэйд 3: Трыца».
0.20 Серыял «Каліфрэнія».
1.10 Серыял «Кліч крыві».

ТБ1000

5.00 Камедыя «Геніяльны тата».
7.10 Анімацыйны фільм «Палярны экспрэс».
9.00 Прыгоды «Пяць дзяцей і чараўніцтва».
11.00 Прыгоды «Пітэр Пэн».
13.00 Драма «Дрэва».
15.00 Меладрама «Харошая дзяўчынка».
17.00 Фантастыка «Вайна светаў».
19.00 Фэнтэзі «Тайна Мунакра».
21.00 Трагікамедыя «Паляванне Ханта».
22.55 Трылер «Прыстаніша».
1.00 Камедыя «Грынберг».
3.00 Драма «Дзяўчына ў парку».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.00 Казка «Чароўная лямпа Аладзіна».
8.00 Камедыя «Правадыр разнаскурых».
10.00 Дэтэктыў «Прыгоды Шэрлака Холмса і Доктара Ватсана. XX стагоддзе пачынаецца».
13.00 Камедыя «Трое ў лодцы, не лічачы сабакі».
16.00 Меладрама «Пра любоff».
18.00 Баявік «Выкрадальнікі кніг».
20.00 Камедыя «Чалавек з бульвара Капуцынак».
22.00 Фільм жахаў «Пуцявы абходчык».
0.00 Меладрама «А мама лепш! Уся чароўнасць кахання».
2.00 Меладрама «Бясконцыя мары пра шчасце».
4.00 Меладрама «Свой — чужы».

NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00, 21.00, 1.00, 4.00 Славіць сома.
6.00, 10.00 Цар кракадзілаў.
7.00 Дзікая прырода Амерыкі.
8.00, 16.00 Паветраныя асы вайны.
9.00, 12.00, 17.00 Апошнія тайны Трэцяга рэйха.
11.00, 19.00 Уцёкі.
13.00, 18.00, 23.00 Апакаліпсіс.
14.00 Палярны мядзведзь.
15.00 Самыя небяспечныя жывёлы.
20.00, 0.00, 3.00 Дзікі тунец.
22.00, 2.00 Паранармальнае.

DISCOVERY

7.00, 16.25 Залатая ліхаманка.
7.50, 12.20, 3.05 У мяне атрымалася!
8.40, 20.05 Патрабуецца зборка.
9.10, 20.35, 4.45 Як гэта зроблена?
9.35, 17.20 Паляўнічыя на рэліквіі.
15.30, 5.10 Змеяловы.
18.15 Круцей не прыдумаеш.
19.10 Што было далей?
21.00 Самагоншчыкі.
22.00 Сакрэтныя аперацыі.
23.00 Смяротная прыхільнасць.
0.00 Уварванне белых акул.
1.50 Вершнікі пекла.
2.40 Маланкавыя катастрофы.

СУБОТА, 3 ЖНІЎНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

5.50 Маст. фільм «Няўлоўныя мсціўцы».
7.05 Маст. фільм «Новыя прыгоды няўлоўных».
8.30 Існасць.
9.00, 12.00, 15.00, 19.00 Навіны.
9.10, 23.30 Меладрама «Выратаваць боса». 1-я і 2-я серыі.
11.10 Здароўе.
12.10 Усё як трэба!
12.35 Баявік «Піраты XX стагоддзя».
14.15 Вакол планеты.
15.15 Навіны рэгіёна.
15.30 «Зорнае жыццё». «Бітва за дзяцей».
16.30 Каробка перадач.
17.00 Меладрама «Кахаць па-руску».
18.35 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
19.15 Камедыя «Дарагая, я павялічыў дзіця».
21.00 Панарама.
21.40 Фантастыка «Сурагаты».
23.20 Дзень спорту.

БЕЛАРУСЬ 2

7.45 М/ф: «Казка для вялікіх і маленькіх», «Брэменскія музыканты», «Па слядах брэменскіх музыкантаў».
8.45 Фільм-казка «Чароўная лямпа Аладзіна».
10.05 Пазакласная гадзіна.
10.25, 20.55 Тэлебарометр.
10.30 Маст. фільм «Трыа».
12.30 Пад грыфам «Вядомыя».
13.10 Дак. серыял «Усе грані вар'яцтва».
13.50 Дача здароўя.
14.25 Меладрама «Пяць крокаў па аблоках». 1-я і 2-я серыі.
16.25 Маст. фільм «Капітан Алатрыстэ».
19.15 Ваша лато.
19.55 Латарэя «Пяцёрачка».
20.15 Вышэй, чым дах.
21.00 «КЕНО».
21.05 Меладрама «Каханне і піца».
22.50 Трылер «Дзённік Алены Рымбаўер».

БЕЛАРУСЬ 3

8.00 «Таямніца душы».
8.30 «Расклад на паслязаўтра». Кінааповесць.
9.50 «Дзень Еўфрасінні».
10.25 «Косава. Маленькі горад з вялікай гісторыяй». Дак. фільм.
10.40 «Плошча мастацтваў». Народная артыстка Беларусі Марыя Захарэвіч.
11.05 «Браслаўшчына. Край Божай апекі». Дак. фільм.
11.40 «Акадэмік Ігнацій Антонаў. Чалавек-легенда». Дак. фільм.
12.30 «Бубен і барабан». Дак. Фільм.
13.00 «АРТiШОК».
13.25, 0.25 Дакументалістыка. «Эпоха. Падзеі і людзі».
14.10 «Уладзімір Сівакоў запрашае...». Оперны галаканцэрт.
15.30 «Янка Купала... Я адплачу народу...». Дак. фільм.
16.00 «Мінск. Таемная вайна». Дак. фільм.
16.25 «Час патрыётаў». Гісторыя беларускага кіно.
16.55 «Ён сэрцам песню адчуваў...». Дак. фільм.
17.30 «Суседзі».
17.45 «Пявучая бронза Занковіча». Дак. фільм.
18.10 «Час яе сыноў». Кінараман.
20.30 Калыханка.
20.55 «Рэпетытар». Меладрама.
22.20 Сусветнае кіно. «Лэдзі Гамільтан». Драма.

АНТ

7.00 «Суботняя раніца».
8.00, 9.00, 16.00, 20.30 Нашы навіны.
9.05 М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».
9.20 «Здароўе».
10.25 «Смак».
11.05 «Ідэальны рамонт».
12.05 «Аляксандр Няўзораў. «600 секунд» і ўсё жыццё».
13.55 Серыял «Спадчына».
16.15, 21.00 Навіны спорту.
16.20 «Адгадай мелодыю».
16.50 «Форт Баярд».
18.20 Маст. фільм «Дублёры».
21.05 «Сёння ўвечары».
22.50 Трылер «Асноўны інстынкт».
1.05 Маст. фільм «Жанчына, якая спявае».

СТБ

6.15 Серыял «Салдаты. Новы прызыў».
8.00 Маст. фільм «Наша шалёнае жыццё».
9.45 «Чыстая праца».
10.35 «100 працэнтаў».
11.00 «Жанчыны XX стагоддзя».
11.30 «Мінск і мінчане».
12.05 «Сакрэтныя тэрыторыі».
13.00 «Прыгоды дылетанта».
13.35 Серыял «Чатыры танкісты і сабака».
15.20 «Ваенная тайна».
16.30, 19.30 «24 гадзіны».
16.45 «Наша справа».
17.00 «Вялікі горад».
17.40 «Такі лёс».
18.30 «Дзіўная справа».
20.00 «СТБ-спорт».
20.10 Камедыя «Вакол свету за 80 дзён».
22.30 «Зорны рынг».
23.30 Маст. фільм «Танцы ў «Блакітнай Ігуане».
1.40 «Глядзець усім!».

МІР

5.00 Дак. фільм «Галівудскія пары».
6.00 М/ф.
7.35 «Мільён пытанняў пра прыроду».
7.50 М/с «Смяшарыкі».
8.15 «Эксперыментатары».
8.30 «Мар! Дзейнічай! Будзь!».
9.00, 15.00 Навіны Садружнасці (бягучы радок).
9.10 «На шашлыкі».
9.40 «Зроблена ў СССР».
10.10, 0.00 Серыял «Час — грошы».
15.10 Серыял «Ненармальная».
20.50 Маст. фільм «Жаданне майго бацькі».
22.25 Маст. фільм «Еўропа — Азія».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Крывое люстэрка».
8.35 Маст. фільм «Апошняя ахвяра».
10.25 «Ранішняя@пошта».
11.00, 14.00, 20.00 Весткі.
11.15 «Суботнік».
11.55 «Уся Расія».
12.10 Маст. фільм «Школьны вальс».
14.15 «Краіна птушак». «Шыкатанскія вароны».
15.10 «Марына Голуб. Не прывыкай да дажджу...».
16.15 Маст. фільм «Цёмныя воды». 1-я серыя.
18.05 «Суботні вечар».
19.55 Надвор'е на тыдзень.
20.30 Маст. фільм «Нялюбая».
23.55 Меладрама «Каханне па раскладзе».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.25 Серыял «Дарожны патруль».
8.00, 10.00, 13.00, 19.00 Сёння.
8.20 «Іх норавы».
8.55 «Гатуем з Аляксеем Зіміным».
9.25 «Справа густу».
10.20 «Галоўная дарога».
10.50 «Кулінарны паядынак».
11.55 «Кватэрнае пытанне».
13.20 «Следства вялі...».
14.10 «Вочная стаўка».
15.05 «Чыстасардэчнае прызнанне».
15.35 «ГРУ: тайны ваеннай разведкі».
16.25, 19.25 Серыял «Дэсант ёсць дэсант».
23.40 Серыял «Глухар. Вяртанне».

8 КАНАЛ

9.00, 13.55, 18.55, 21.05, 23.40 «Надвор'е».
9.05 Мультпарад.
9.15 «На рыбалку».
9.30 Серыял «Праслушка».
11.30 «Даведнік па краінах і кантынентах».
11.40 Драма «У імя айца».
14.00 Драма «Вялікія надзеі».
15.50 «Кінаблакнот».
16.00 «Адшукваецца адпачынак».
16.30 Фільм — дзецям. Серыял «Прыгоды Шырлі Холмс».
17.20 Серыял Серыял «Шэкспір на новы лад».
19.00 Камедыя «Безразважна закаханы».
20.50 «Вечарніца».
21.10 Трылер «Помста».

ВТБ

6.00, 1.00 «PLAY».
8.30 Серыял «Татавы дочкі».
9.30 «Бітва інтэр'еraў».
10.30, 13.00, 0.00 «Улётнае відэа».
11.00 «Сукенка маёй мары».
11.30, 17.00, 23.20 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
12.00, 21.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
12.30, 17.30, 0.30 Скетч-шоу «Анекдоты».
13.30, 21.00 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
14.00 Серыял «Нанакаханне».
16.00 «Практычная магія».
18.00 «Нерэальная гісторыя».
19.00 «Уральскія пельмені».
22.10 «Кіно ў дэталях».

ІНТЭР+

5.55 Маст. фільм «Жалезнае поле».
7.15 Канцэрт памяці Мікалая Мазгавога.
9.30 Смартшоу.
10.00 Дак. серыял «Украіна. Забытая гісторыя».
10.45, 23.10 Летняя кухня.
11.30 Серыял «Кантар», 1-я серыя.
12.20 Маст. фільм «Вертыкаль».
13.35 Маст. фільм «Між высокіх хлябоў».
14.50, 5.00 Вялікі канцэрт на Інтэры.
16.50, 23.00 Краіна смяецца.
17.05 Дак. фільм «Рок шасцідзясятых».
17.45, 23.55 Легенды крымінальнага вышуку.
18.15, 0.25 Агенты ўплыву.
19.00, 1.10 Футбол. Чэмпіянат Украіны.
21.00, 3.00 Падрабязнасці.
21.30, 3.30 Маст. фільм «Цягнік да Брукліна».

НАСТАЛЬГІЯ

5.00, 11.00 «Ад усёй душы. Юбілейныя сустрэчы». 1977 год.
6.10 «Абавязковая праграма». Дак. фільм.
6.40, 12.40, 0.40 «Мяжа магчымага». Маст. фільм.
8.00, 14.00, 20.00, 2.00 «Час».
9.00, 21.00, 3.00 «Народжаныя ў СССР».
10.00, 4.00 «Праграма «А». 1989 год.
12.05 «Ранішняя пошта». 1983 год.
15.00 «Колба часу».
16.00 «Погляд». 1988 год.
17.00 «Быў час». 2009 год.
18.00 «Наша біяграфія». Дак. фільм.
19.00 «Вакол смеху». 1981 год.
20.30 «Бамонд». 1992 год.
21.00 «Мама Ануш». Маст. фільм.
22.20 «Ля мікрафона Юрый Левітан». Дак. фільм.
23.00 «Канцэрт Яўгена Клячкіна». 1990 год.
0.10 «Вороне где-то Бог...». Дак. фільм.

EUROSPORT

9.30, 11.00, 15.00, 18.30, 0.30 Плаванне. Чэмпіянат свету. Фіналы.
14.00, 21.30 Скачкі на лыжах. Летні Гран-пры.
14.45 Футбол. Чэмпіянат Еўропы (U-19). Фінал.
17.30, 22.15, 2.30 Чэмпіянат свету па водных відах спорту.
1.25 Sports excellence.
1.30 Веласпорт. Тур Польшчы.
*3.00 — **Тэхнічны перапынак.***

КАМЕДЫЯ

5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.10 «Паміж намі».
5.15, 12.55, 21.05 Камедыя «Праца».
5.45, 13.35, 21.35 Камедыя «Вандроўца».
6.15 Камедыя «Скажы так».
8.00, 16.00, 2.25 Камедыя «Уцёкі ў аўтамабілі».
8.30, 16.30, 2.55 Камедыя «Бадзяга».
9.00 Камедыя «Сакрэт майго поспеху».
11.15 Мюзікл «Другі хор».
12.40 «Камедыянты. Лепшае».
14.10 Камедыя «Дурням закон не пісаны».
17.20 Камедыя «Лютыя ставрэнні».
19.20 Камедыя «Атрад Беверлі Хілз».
22.10 Камедыя «Дзейнічай, сястра 2. Старыя звычкі».
23.50 Камедыя «Шафёр на адзін рэйс».
3.25 Камедыя «Карсіканец».

ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

2.00, 8.00, 14.00 Маст. фільм «Старая крэпасць».
3.05, 9.05, 15.05 М/ф «Трое з Прастаквашына». Зборнік м/ф «Раз гарох, два — гарох...». «Драўляныя чалавечкі». «Чучала мяучала».
4.00, 10.00, 16.00 М/с «Вялікая энцыклапедыя прыроды». Казкі рускіх пісьменнікаў. «Горны майстар». Рускія народныя казкі. «Ліса і заяц».
5.00, 11.00, 17.00 Фільм-казка «Пунсовая кветачка». Камедыя «Барбос у гасцях у Бобіка».
6.30, 12.30, 18.30 М/с «Легенда пра Зора».
7.00, 13.00, 19.00 «Урокі цётачкі Савы». Зборнік м/ф «Даверлівы дракон». «Мой сябар Парасонік». «Вожык плюс чарапаха».

ТБ3

6.00 М/ф.
9.00, 5.05 Серыял «Сябры».
9.50 Маст. фільм «Піраты Карыбскага мора: на дзіўных берагах».
12.20, 3.30 Драма «Не бядуй!».
14.05, 1.45 Серыял «Вар'яты».
16.00 М/ф «Ледніковы перыяд 2: глабальнае пацяпленне».
17.30 Фэнтэзі «Хронікі Нарніі: Леў, вядзьмарка і чароўная шафа».
20.20 Маст. фільм «Сёмы дзень».
22.30 Меладрама «Міс Перцігру».
0.20 Серыял «Каліфрэнія».
0.55 Серыял «Кліч крыві».

ТБ1000

5.00 Меладрама «Харошая дзяўчынка».
7.00 Трылер «Прыстаніша».
9.05 Фэнтэзі «Тайна Мунакра».
11.00 Камедыя «Грынберг».
13.00 Фантастыка «Вайна светаў».
15.00 Мюзікл «У рытме сэрца».
16.50 Трагікамедыя «Моцная жанчына».
19.10 Драма «Чароўная краіна».
21.00 Драма «Дзяўчына ў парку».
23.00 Драма «Пасажыры».
0.40 Жахі «Прывід дома на ўзгорку».
2.45 Баявік «Чорнае золата».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.00 Дэтэктыў «Прыгоды Шэрлака Холмса і Доктара Ватсана. XX стагоддзе пачынаецца».
8.00 Меладрама «Бясконцыя мары пра шчасце».
10.00 Камедыя «Шуб-баба Люба!».
12.00 Драма «Заўтра была вайна».
14.00 Баявік «Выкрадальнікі кніг».
16.00 Камедыя «Чалавек з бульвара Капуцынак».
18.00 Камедыя «Каўчэг».
20.00 Камедыя «Шапіто-шоу: Каханне і сяброўства».
22.00 Баявік «Разгільдзяй».
23.35 Драма «Жыць».
1.45 Казка «Чароўная лямпа Аладзіна».
3.20 Меладрама «Настройшчык».

NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00, 11.00 Каралева гіен.
6.00, 12.00 Самыя небяспечныя жывёлы.
7.00 80-я: найвялікшыя трагедыі.
8.00 Злавіць сома.
9.00 З пункту гледжання навукі.
10.00 У пошуках акул.
13.00 Шаша праз пекла.
14.00 У аб'ектыве.
15.00 Дзікія жывёлы Поўначы.
16.00 Аўта-SOS.
17.00 Неверагодная цела чалавека.
19.00 Дзікі тунец.
20.00, 0.00, 4.00 Ліхтугі за мяжой.
21.00, 1.00 Секунды да катастрофы.
22.00, 2.00 Амерыканская калонія.
23.00, 3.00 Расследаванні авіякатастроф.

DISCOVERY

7.00, 17.20 Патрабуецца зборка.
7.25, 16.25 Круты цюнінг 2012 г.
8.15, 19.10 Ледзяное золата.
10.05, 12.45, 3.30 Войны за малюскаў.
11.00, 23.00, 6.05 Адпетыя рыэлтары.
11.50, 21.00 Паляўнічыя на рэліквіі.
13.40 Суперяхты.
14.35 Што было далей?
15.30 У пагоні за класікай.
17.50, 4.45 Як гэта зроблена?
18.15, 1.50 Самагоншчыкі.
20.05, 2.40 Аляска: апошні рубеж.
22.00, 5.10 Каралі аўкцыёнаў.
23.30 Смяротная прыхільнасць.
0.55 Сакрэтныя аперацыі.
4.20 Маланкавыя катастрофы.

НЯДЗЕЛЯ, 4 ЖНІЎНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

7.30 Баявік «Піраты XX стагоддзя».
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 Арсенал.
9.40, 0.45 Меладрама «Выратаваць боса».
11.45 Нашы.
12.10 Маст. фільм «Няўлоўныя мсціўцы».
13.35 Маст. фільм «Новыя прыгоды няўлоўных».
15.15 Навіны рэгіёна.
15.30 Зона Х. Вынікі тыдня.
16.00 Камедыя «Жандар у Нью-Ёрку».
17.50 «Мая праўда». «Анёлы і дэманы Івана Ахлабысціна». 2-я частка.
18.50 Драма «Белы палон».
21.00 У цэнтры ўвагі.
21.55 Журналісцкае расследаванне.
22.30 Дэтэктыў «Прывід».
21.10 Трылер «Эфект матылька-2».
22.55 Драма «Полымя страсці».

БЕЛАРУСЬ 3

8.00 «Дабравест».
8.30 М/ф.
9.10 «Час яе сыноў». Кінараман.
11.30 «Рэпетытар». Меладрама.
13.00 «Наперад у мінулае».
13.30 «Міколка-паравоз». Маст. фільм.
15.00, 22.05 Дакументалістыка. «Эпоха. Падзеі і людзі».
15.40 «Святло далёкай зоркі». Памяці мастака Мікалая Селяшчука.
16.10 «Друзей моих прекрасные черты...».
16.40 «У рэху імені твайго...». Барбара Радзівіл.
16.55 «Беларускі народны каляндар». Сёмуха.
17.15 «Край белавежскі». Дак. фільм.
17.25 «Пяць дзён з жыцця генеральнага канструктара». Дак. фільм.
18.00 «Слуцкая анамалія. Пераатасаваная гісторыя». Дак. фільм.
18.30 Сусветнае кіно. «Лэдзі Гамільтан». Драма.
20.30 Калыханка.
20.45 «Уладзімір Сівакоў запрашае...». Оперны галаканцэрт.
22.45 «Сястра мая Русалачка». Спектакль Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача.

АНТ

7.00 «Нядзельная раніца».
8.00, 9.00, 16.00 Нашы навіны.
9.05 Нядзельная пропаведзь (з субцітрамі).
9.20 М/с «Смяшарыкі. ПІНкод».
9.35 «Бесталковыя нататкі».
9.55 «Пакуль усе дома».
10.50 «Фазэнда».
11.25 Мюзікл «Сільва».
14.25 «КВЗ». Прэм'ер-ліга.
16.15 Навіны спорту.
16.20 «Івар Калныньш. Раман з акцэнтам».
17.30 Серыял «Браты Карамазавы».
20.00 Контуры.
21.05 «Вышка».
23.00 Закрыты паказ. Маст. фільм «Сэрца на далоні».

СТБ

6.05 Серыял «Салдаты. Новы прызыў».
7.50 Камедыя «Вакол свету за 80 дзён».
10.00 «Аўтапанарама».
10.30 «Тайны свету».
11.30 «Вялікае сненданне».
12.10 «Добры дзень, доктар».
12.45 Серыял «Чатыры танкісты і сабака».
14.55 «Тэрыторыя памылак».
16.00 «Цэнтральны рэгіён».
16.30 «24 гадзіны».
16.50 «Аўтапанарама».
17.20 «Рэпарцёрскія гісторыі».
17.50 Канцэрт Міхаіла Задорнава.
19.30 «Тыдзень».
20.40 Драма «Кармэн».
22.55 «Якія людзі!».
23.50 Маст. фільм «Свет, я цябе люблю».
1.15 Дак. серыял «Джуна. Патой і гэты бок».

М

КАЛІ СЦІРАЮЦЦА МЕЖЫ...

Цягам двух дзён у Міжнародным адукацыйным цэнтры імя Ёханэса Рау панавала атмасфера беларушчыны. Сотні людзей, частка якіх была апранута ў нацыянальныя строі, віталіся, размаўлялі (часам з моцным акцэнтам) па-беларуску, абмяркоўвалі пытанні нацыянальнай ідэнтычнасці, абменьваліся запрашэннямі ў госці, спрачаліся, дзяліліся праблемамі і планамі... Нават ахоўнікі ў канферэнц-зале былі апрануты ў вышываныя кашулі, падперазаныя паясамі. Так у Мінску праходзіў VI з'езд беларусаў свету.

Міжнароднае грамадскае аб'яднанне «Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына» ладзіць з'езды раз на чатыры гады, пачынаючы з 1993 года. Тады, на 1-м з'ездзе, сабралася больш за тысячу чалавек — дэлегатаў з беларускіх асяродкаў замежжа і Беларусі. Сёлетнія лічбы значна больш сціплыя: у Мінск прыехалі 254 дэлегаты (з заяўленых 330) з Беларусі, краін блізкага замежжа, а таксама з ЗША, Венгрыі, Чэхіі, Даніі, Швейцарыі ды іншых краін свету. Адметнасцю сёлетняга форуму стала тое, што ён супаў з 20-годдзем правядзення першага з'езда.

Падчас адкрыцця форуму **кіраўнік МГА «ЗБС «Бацькаўшчына» Алена МАКОЎСКАЯ** прамовіла:

— Наш з'езд асаблівы, бо адбываецца ў юбілейны год. Гэта стала добрай нагодай ацаніць здабыткі і страты мінулага, а таксама акрэсліць нашы планы на будучыню. Магчыма, 20 год — не надта вялікі час, каб вырашыць усе праблемы. Магчыма, мы не зрабілі ўсё, што павінны былі зрабіць. Мы з розных краін, мы належым да розных пакаленняў, у нас розны вопыт і розныя ўмовы дзейнасці, у нас розныя погляды. Але тое, што нас яднае, нашмат большае: гэта тое, што мы — беларусы.

Сёлетні з'езд быў прысвечаны выклікам і магчымасцям беларускай нацыі ва ўмовах глабалізацыі. Як адзначыла Алена Макоўская, «ва ўмовах, калі ўніверсальная культура становіцца ўсё больш распаўсюджанай, усё большую каштоўнасць набываюць нацыянальныя асаблівасці. І тым больш намаганняў патрабуецца для таго, каб іх захоўваць і развіваць».

Сёння па-за межамі Беларусі пражывае звыш 3,5 мільёна нашых суайчыннікаў. У больш чым 20 краінах свету дзейнічае звыш 200 беларускіх арганізацый і асяродкаў. Чым жывуць яны сёння? Адзін з дэлегатаў з'езда, **кіраўнік «Беларускай абшчыны ў Рэспубліцы Малдова» Юрый СТАТКЕВІЧ** падзяліўся з карэспандэнтам «Звязды»:

— Наша суполка аматарская. Мы стварылі нядзельную школу, дзе дзеці і дарослыя вывучаюць беларускую мову, гісторыю Беларусі. Святкуем беларускія народныя святы — Гуканне вясны, Каляды, Купалле, Дзяды. Падтрымліваем нашых суайчыннікаў у Малдове. У суполцы існуе літаратурны гурток, праводзяцца выставы мастакоў. За 20 гадоў існавання суполкі мы выдалі 18 зборнікаў вершаў беларускіх паэтаў, а таксама двухтомнік вершаў паэтаў Малдовы на беларускай мове.

Па словах Юрыя Статкевіча, сёння сталічная суполка налічвае больш за 300 удзельнікаў. Акрамя таго, беларускія згуртаванні існуюць у шасці буйных гарадах Малдовы. Але ёсць і пэўныя цяжкасці. Галоўная з іх заключаецца ў фінансаванні, а дакладней, яго адсутнасці: арганізацыя існуе на ахвяраванні яе ўдзельнікаў. Таксама ёсць унутраная праблема: у суполку прыходзіць мала моладзі. Гэтыя дзве прычыны, на думку Юрыя Статкевіча, узаемазвязаны.

Мы з розных краін, мы належым да розных пакаленняў, у нас розныя погляды. Але тое, што нас яднае, нашмат большае: гэта тое, што мы — беларусы.

А вось беларуская дыяспара на тэрыторыі Швейцарыі хоць і дзейнічае ўсяго 1,5 года, але актыўна развіваецца. **Кіраўнік Асацыяцыі беларусаў у Швейцарыі Аляксандр САПЕГА** (які прызнаўся, што не з'яўляецца нашчадкам знакамітага магнацкага роду), распавёў «Звяздзе»:

— Па афіцыйных даных на 2012 год, у Швейцарыі пражывала 2,5 тысячы беларусаў. Але праблема ў тым, што іх складана сабраць разам. Аднак мы ладзім культурныя мерапрыемствы, у якіх удзельнічаюць не толькі беларусы, але і ўкраінцы, расіяне, швейцарцы, што цікавяцца Беларуссю. На жаль, наша моладзь не такая актыўная, як старэйшае пакаленне. Але, тым не менш, летась у нашай асацыяцыі было 20 чалавек, а цяпер амаль 90.

Павітаць удзельнікаў мерапрыемства прыйшлі прадстаўнікі Пасольства Украіны, Пасольства Нідэрландаў у Польшчы і Беларусі, а таксама дзяржаўных органаў улады Беларусі: Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, міністэрстваў культуры, адукацыі, эканомікі, замежных спраў, а таксама асабіста міністр культуры Барыс Святлоў і ўпаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Леанід Гуляка. Прагучалі вітанні ад першасвятароў праваслаўнай і грэка-каталіцкай цэркваў. Віншаванні форуму даслаў нават прафесар Барыс Кіт, якому цяпер 103 гады.

Сам з'езд пачаў сваю працу з выбару працоўных органаў. Затым на працягу двух дзён дэлегаты прадстаўлялі аўдыторыі справаздачы, выступы, праекты, прапановы. Падчас свайго дакладу Алена Макоўская нагадала пра асноўныя пытанні, якія «чырвонай лініяй» праходзяць праз усе з'езды: гэта стварэнне заканадаўчай базы для супрацоўніцтва дзяржавы і беларускай дыяспары і адкрыццё Беларускага дома. Была ўзнята і праблема міграцыі беларусаў у краіны блізкага замежжа. Пры гэтым Алена Макоўская зазначыла, што з Беларусі можа «вымыцца» самы каштоўны рэсурс — людзі.

Ва ўмовах, калі ўніверсальная культура становіцца ўсё больш распаўсюджанай, усё большую каштоўнасць набываюць нацыянальныя асаблівасці.

— Мы не можам супрацьстаяць працоўнай міграцыі. Мы жывём у час глабалізацыі, але можам агульнымі высілкамі дзяржавы і грамадскасці супрацьстаяць асіміляцыі, развіваць і падтрымліваць нацыянальную культуру, зрабіць так, каб беларуская мова заняла належнае месца ва ўсіх сферах жыцця, — упэўнена яна.

Увогуле адным з найважнейшых пытанняў, якое абмяркоўвалі падчас з'езда, было менавіта захаванне нацыянальнай мовы. Згодна з вынікамі сацыялагічнага апытання, з часу апошняга з'езда 2009 года на 10 — 15% знізілася колькасць беларускамоўных сярод дыяспары.

— Калі ў першым пакаленні чалавек губляе мову, то ў другім—трэцім ён губляе нацыянальнасць, — справядліва канстатаваў **старшыня Таварыства беларускай мовы Алег ТРУСАЎ.** А **кіраўнік рэгіянальнага грамадскага аб'яднання «Іркуцкае таварыства беларускай культуры імя Яна Чэрскага» Алег РУДАКОЎ** на гэты конт заўважыў, што размаўляць на нацыянальнай мове трэба не толькі сярод абмежаванага кола аднадумцаў, а неабходна «ісці ў народ». І дадаў, што падчас прыездаў у Беларусь сам заўжды размаўляе па-беларуску.

Між тым, у дачыненні мовы на мерапрыемстве ў карэспандэнта «Звязды» склалася цікавае назіранне: беларусы далёкага замежжа прадстаўлялі свае прамовы пераважна па-беларуску, а некаторыя дэлегаты з ліку бліжэйшых нашых суседзяў — Расіі і Украіны — выступалі па-руску. Здавалася б, каму лягчэй авалодаць мовай?.. Здараліся нават казусныя выпадкі. Напрыклад, калі адзін з беларусаў Украіны паведаміў, што ў дзяцінстве яго білі за ўжыванне беларускай мовы, нехта адзначыў, што «мала білі», пасля чаго зала выбухнула смехам. А вось дэлегатка, якая з чатырох гадоў жыве ў Эстоніі, распавяла, што, не маючы моўнага асяродку, свабодна размаўляе і піша па-беларуску. «Было б жаданне», — падсумавалі ў прэзідыуме з'езда.

Фота БЕЛТА.

Акрамя агучвання дакладаў, на сходзе праводзілася праца ўдзельнікаў па секцыях. Сёлета яны ахапілі наступныя тэмы: «Магчымасці ўнутраных сіл Беларусі і дыяспары па ўмацаванні нацыянальнай ідэнтычнасці», «Новая» і «старая» эміграцыі: супрацоўніцтва на карысць нацыянальнага развіцця», «Культурная спадчына беларускага замежжа». Па выніках работы секцый дэлегаты вылучылі канкрэтныя прапановы па ўмацаванні беларускай ідэнтычнасці — такія як эканамічнае і культурнае стымуляванне членаў дыяспары (асабліва моладзі) для актыўнага ўдзелу ў беларускім жыцці за мяжой або вяртання на радзіму; стварэнне прывабнай, эфектыўнай, грамадска актыўнай і канкурэнтаздольнай «беларускай мары» і іншыя.

Нягледзячы на тое, што на сходзе сабраліся аднадумцы, не абышлося і без спрэчак, якія разгарэліся падчас прыняцця выніковых дакументаў з'езда. Тым не менш большасць дэлегатаў прагаласавала за прыняцце звароту да кіраўніцтва Рэспублікі Беларусь пра стварэнне заканадаўчай і нарматыўна-прававой асновы для ўзаемадзеяння з беларусамі замежжа, праграмы «Беларусы замежжа» на 2013 — 2017 гг., рэзалюцыі «Беларуская мова — галоўны фактар захавання беларускай нацыі», заявы «Пра акт добрай волі», рэзалюцыі «Пра захаванне гістарычна-культурнай спадчыны» і «Пра транслітарацыю найменняў беларускіх геаграфічных аб'ектаў», а таксама за выніковую рэзалюцыю дэлегатаў VI з'езда беларусаў свету. Напрыканцы форуму было абрана кіраўніцтва МГА «ЗБС «Бацькаўшчына». На чале арганізацыі засталася Алена Макоўская.

Сустрэча беларусаў свету пакінула пасля сябе неадназначныя ўражанні ў яе ўдзельнікаў.

— Шчыра кажучы, ад з'езда я чакаў іншага, — падзяліўся прадстаўнік беларусаў у Швейцарыі Аляксандр Сапега. — Бо я разлічваў, што будуць уздымацца пытанні актыўнасці беларусаў за мяжой, а большасць тэм, якія прагучалі, закранала праблемы, звязаныя з жыццём у Беларусі. Я лічу, што гэта павінны вырашаць грамадзяне, якія пражываюць на тэрыторыі дзяржавы, а не эмігранты.

— З'езд — гэта крок наперад у развіцці нашых узаемаадносін з дыяспарай, — зрабіў выснову па выніках форуму **ганаровы сябар Вялікай Рады «Бацькаўшчыны» Адам МАЛЬДЗІС.** — «Бацькаўшчына» пасталела. Добра, што ў арганізацыю за гэты час прыйшлі новыя маладыя людзі. У той жа час аб'яднанне не забываецца на сваіх членаў, якія даўно і плённа працавалі на яго карысць. Таксама важна, што на гэтым з'ездзе ўпершыню прысутнічалі і адносныя «левыя» і «правыя», «прагрэсісты» і «кансерватары». Асабліва добра гэта было відаць на прыкладзе Масквы, Малдовы, Літвы. Затое мяне здзівіла і шакіравала, што ў Латвіі і ў Польшчы дагэтуль ніяк не могуць падзяліць паміж сабой уладу ў дыяспары. Гэтым самым яны шкодзяць успрыняццю беларусаў у сваіх краінах. Таксама добра, што на з'ездзе прысутнічаў міністр культуры, але ў кулуарах усе казалі: «А дзе астатнія міністры?..» Яшчэ адна рэч здзівіла мяне падчас з'езда. У нас існуе дзве грамадскія арганізацыі па падтрымцы сувязяў з дыяспарай — «Бацькаўшчына» і «Радзіма». Другая чамусьці адсутнічала на сустрэчы. Навошта рабіць супрацьстаянне? Наадварот, трэба працаваць на ўзаемаразуменне, тым самым умацоўваючы нашу незалежнасць.

Дзіяна СЕРАДЗЮК.

■ Прыемная навіна

«ПОШТА НІ Ў ЯКІМ РАЗЕ НЕ СТРАЧВАЕ СВАЁЙ ЗАПАТРАБАВАНАСЦІ»

...Яшчэ колькі гадоў таму гарачыя галовы прадказвалі, што са з'яўленнем інтэрнэту, электроннай пошты патрэба ў звычайнай адпадзе. Аднак усё аказалася не так проста. Паштовыя аддзяленні, як і раней, ніколі не пустуюць, а часам нават збіраюць «аншлагі». У любым выпадку, адсутнасць іх у мікрараёне становіцца для жыхароў сапраўднай праблемай. На шчасце — вырашальнай. У Мінску на вуліцы Іосіфа Жыновіча, 21 адкрылася аддзяленне сувязі з прыгожым нумарам 55.

Раніца аўторка вітала дажджом а то і залевай. Нягледзячы на гэта, мясцовыя жыхары ўсё ж-такі завіталі ў аддзяленне. Кожнага кліента паштавікі адразу ж, што называецца, бралі «ў абарот»: паказвалі новае аддзяленне, расказвалі пра навацыі і дапамагалі атрымаць патрэбную паслугу. Здзіўленыя такой увагай, наведнікі пачыналі ўсміхацца і з радасцю заставаліся для ўдзелу ва ўрачыстых мерапрыемствах.

З-за дажджу вулічная, так бы мовіць, іх частка была зведзена да мінімуму: пасля кароткай прамовы пад апладысменты супрацоўнікаў чырвоную стужку разрэзалі **намеснік генеральнага дырэктара РУП «Белпошта» па камерцыйных пытаннях Таццяна ГВОЗДЗЕВА** і **начальнік вытворчасці «Мінская пошта» Віктар БУТРЫМ.** У сваім вітальным слове Таццяна Мікалаеўна зазначыла, што за некалькі гадоў новы мікраараён Дамброўка моцна разросся, і патрэба ў сваім аддзяленні сувязі стала надзвычай актуальнай. «Добра, што ў прадпрыемства з'явілася фінансавая магчымасць, каб пайсці кліентам насустрач, — сказала яна. — Спадзяюся, што нашы паслугі для жыхароў мікраараёна зараз стануць не толькі даступнымі, але і камфортнымі. Хочацца таксама пажадаць поспехаў супрацоўнікам: сёння дождж, а гэта, кажуць, да фінансавага дабрабыту!».

Аддзяленне адкрывае начальнік вытворчасці «Мінская пошта» Віктар БУТРЫМ.

Фота Надзеі БУЖАН.

Віктар Бутрым у сваім звароце да прысутных у асноўным аперыраваў лічбамі. Па яго словах, аддзяленне сувязі на вуліцы Жыновіча стала 20-м у Фрунзенскім раёне і 114-м у Мінску. Абслугоўваць яно будзе каля 19 тысяч чалавек. Акрамя таго, ён зазначыў, што ў бліжэйшы час запрацуюць пошты на вуліцах Адзінцова і Панчанкі.

Пасля ўрачыстага адкрыцця для гасцей мерапрыемства правялі невялікую экскурсію па аддзяленні. Тут працуе сістэма электроннай чаргі, а таму кліентам не прыйдзецца шукаць патрэбную касу і стаяць ля яе ў чаканні. Дарэчы, такі парадак павышае і ўзровень бяспекі, бо менавіта традыцыйныя жывыя чэргі з'яўляюцца ўлюбёным месцам «працы» кішэннікаў. Для хуткіх плацяжоў у памяшканні ўсталяваны інфакіёск.

Асобны стэнд для філатэлістаў знаходзіцца збоку ад кас — цяпер аматарам паштовых марак не прыйдзецца «прабівацца» да акенца, каб проста выбраць патрэбнае. Нельга забывацца і на стандартны спектр паслуг: у аддзяленні можна падпісацца на любімыя выданні, набыць канверты, адправіць пасылкі ці грашовыя пераводы і многае іншае.

Асобнае памяшканне — для аб'ёмных адпраўленняў. А гэта значыць, каб забраць вялікую бандэроль, кліенту не трэба будзе падымаць і перастаўляць яе ў агульнай зале. І наогул, аддзяленне зроблена так, каб зручна было і яго наведнікам, і персаналу: ёсць, напрыклад, сваё невялікае памяшканне для адпачынку — з лядоўняй, мікрахвалёўкай, чайнікам.

І наогул, у апошнія гады беларуская пошта зрабіла вялікі крок наперад у скарачэнні сярэдняга часу абслугоўвання кліента, хоць аператары і зазначаюць, што многія пенсіянеры прыходзяць на пошту не толькі па паслугі. Ім хочацца... пагаварыць, і, калі гэта не замінае іншым кліентам, паштавікі заўжды гатовыя выслухаць.

— Пошта ні ў якім разе не страчвае сваёй запатрабаванасці, — адказвае на наша пытанне Віктар Францавіч Бутрым. — Інтэрнэт не перашкаджае, а нават наадварот: зараз людзі робяць вельмі шмат пакупак з яго дапамогай, у тым ліку з-за мяжы. Набытыя тавары дастаўляем мы. Ды і звычайныя лісты, віншаванні, пераводы, пасылкі не страчваюць сваёй актуальнасці, многія людзі падтрымліваюць сувязь менавіта такім чынам. Вялікі працэнт займае дзелавая перапіска. Дарэчы, ужо сёлета мы ўвядзём у эксплуатацыю новы аўтаматызаваны комплекс на вуліцы Вакзальнай. Сартаванне будзе праходзіць без удзелу чалавека і значна скароціць час апрацоўкі лістоў. Аб'яўлены тэндар на закупку мультысартавальнай машыны для размеркавання нестандартных адпраўленняў і пасылак. Таму беларуская пошта запрацуе яшчэ лепш.

...Між тым, у аддзяленне сувязі пачынаюць падцягвацца ўсё новыя і новыя кліенты. Сваімі ўражаннямі дзеліцца Аксана, адна з жыхарак Дамброўкі:

— Гэта вельмі добра, што ў нас нарэшце з'явілася свая пошта. Ужо паўтара года тут жывём. Даводзілася ездзіць на вуліцу Прытыцкага: тры прыпынкі на аўтобусе, потым пешшу... А цяпер усё «пад бокам», вельмі зручна. Тым больш што паслугамі пошты наша сям'я карыстаецца вельмі актыўна: акрамя звычайных плацяжоў, мы часта атрымліваем пасылкі, выпісваем дзецям часопісы.

Застаецца спадзявацца, што са з'яўленнем новага аддзялення сувязі жыццё многіх мінчан сапраўды стане больш простым. Галоўнае, каб было каму хадзіць. Бо не адной электроннай поштай жыве чалавек.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ

■ На свае вочы

ВЕЛАСІПЕДНЫЯ ДАРОЖКІ І «НАРОДНАЯ ДЫПЛАМАТЫЯ»

Карэспандэнт «Звязды» пабываў там, дзе Нёман цячэ ў напрамку... усіх краін свету

Памежнае становішча Гродзеншчыны шмат для каго асацыіруецца, пэўна, найперш з чэргамі легкавікоў і «фур» у пунктах пропуску, з саляркай, цыгарэтамі і іншымі таварамі, ад перамяшчэння якіх з адной краіны ў іншую можна атрымаць выгаду. Але, на шчасце, гэтым стасункі суседзяў не абмяжоўваюцца — іх яднаюць і сумесныя справы ў самых розных сферах. Напрыклад, нядаўна ў Гродне і Ашмянах у партнёрстве з Бірштанасам і Алітусам узяліся за рэалізацыю праекта «Развіццё веласіпеднага турызму і турысцка-інфармацыйнай сістэмы ў памежным рэгіёне Літвы і Беларусі».

У ПАДАРОЖЖА — НА ВЕЛАСІПЕДЗЕ!

Па мястэчку Бірштанас і навакольлі члены беларускай дэлегацыі (работнікі органаў улады, турыстычнага бізнесу, праекціроўшчыкі, журналісты) падарожнічалі не толькі пехатой, але і, зразумела, на веласіпедах — згодна з тэмай міжнароднага праекта па праграме добрасуседства «Латвія—Літва—Беларусь». З агульнай сумы (705 тысяч еўра) 90% выдзяляецца Еўрасаюзам, 10% — мясцовымі бюджэтамі. У рамках праекта ў Ашмянах пабудуюць сучасную веладарожку (1,8 км) у сасновым бары. А ў гродзенскім лесапарку Пышкі з'явіцца веласіпедны маршрут з грунтовым пакрыццём (30,5 км), які будзе прамаркіраваны спецыяльнымі знакамі і абсталяваны дванаццаццю месцамі адпачынку. Акрамя таго, для велатурыстаў падрыхтуюць карту і даведнік з пазначэннем тых ці іншых аб'ектаў па маршруце падарожжа, а таксама з парадамі па выбары веласіпеда, экіпіроўкі, умовамі кіравання гэтым транспартным сродкам.

Такім чынам, марудна і супярэчліва (пры будаўніцтве і рэканструкцыі дарог інтарэсы веласіпедыстаў, як правіла, па-ранейшаму не ўлічваюцца), але мы пачынаем рухацца ў «веласіпедным» кірунку, які ўжо даўно вельмі шануецца ў многіх краінах. Прычым, па вопыт неабавязкова ехаць у Берлін ці Парыж: ён побач, у нашых суседзяў.

На тэрыторыі самакіравання Бірштанаса, якая складае 124 квадратныя кіламетры, ужо абсталявана каля 30 кіламетраў веладарожак. Аднымі з першых у Літве, паведаміў **каардынатар літоўска-беларускага праекта Антанас САБАНАС,** распрацавалі спецыяльны план для веласіпедных дарог, і задача на перспектыву — мець іх каля 100 кіламетраў. Больш за тое, цяпер будуецца веладарожка да суседняга мястэчка Прэнай. Пры гэтым прадстаўнікі мэрыі трымаюць пад пільным кантролем якасць работ, каб не прыйшлося перарабляць пасля візіту інспектараў Еўрапейскай камісіі. Праверка можа адбыцца ў любы момант, а таксама на працягу пяці гадоў пасля здачы аб'екта, які будаваўся за сродкі з еўрапейскіх фондаў.

Цяпер Бірштанас без веласіпедаў цяжка і ўявіць. Мясцовыя жыхары пераважна карыстаюцца ўласнымі, а для гасцей веласіпеды на любы густ у трох пунктах пракату і ў кожным атэлі. Як пераканаўся аўтар гэтых радкоў, праехаць веласіпедам у горадзе можна ўсюды. Прычым, з гэтым транспартным сродкам адчуваеш сябе не нейкім «іншародным целам», якому з-за адсутнасці веладарожак месца толькі на тратуары, а натуральна, годна.

Дарэчы, веласіпедныя дарожкі ў цэнтральных частках гарадоў, на думку нашых літоўскіх партнёраў, маюць і ... эканамічны аспект. Калі перавага там надаецца не аўтамабільнаму руху, а веласіпеднаму і пешаходнаму, то будзе больш наведвальнікаў — патэнцыяльных кліентаў гандлю і сферы паслуг.

«ДЗЕ ВАШ БІРШТАНАС?»

82% тэрыторыі Бірштанскага самакіравання займае рэгіянальны парк выгібаў Нёмана. Мэта — захаванне ўнікальнага ландшафту, прыродных і археалагічных помнікаў, рэдкіх раслін і жывёл. «Аўтар» гэтага ландшафту — рака Нёман, якая на 65-кіламетровым участку сфарміравала тры выгібы і цячэ ў напрамку... усіх краін свету.

Зрэшты, калі ў таго ці іншага рэгіёна ёсць свае адметнасці, «фішкі», то гэта яшчэ не гарантыя турыстычнай прывабнасці. Нічога не атрымаецца, калі сядзець склаўшы рукі ў чаканні гасцей. Гэтаму пацвярджэнне — Бірштанас.

Здавалася б, ёсць апрабаваны часам гістарычны брэнд: ажно ў 1382 годзе разведчыкі ордэна крыжаносцаў паведамілі вялікаму магістру, што знайшлі побач з Нёманам «сядзібу каля салёнай вады». Гаючыя мінеральныя крыніцы здаўна прыцягвалі сюды князёў ВКЛ, пісьменнікаў, музыкантаў, мастакоў... І тым не менш, кажа **дырэктар мясцовага цэнтра турыстычнай інфармацыі Рута КАПАЧЫНСКАЙТЭ,** яшчэ пяць гадоў таму патэнцыяльныя наведвальнікі курорта часта пыталіся: «Дзе ваш Бірштанас?» Значыць, не хапала інфармацыі, і таму актывізавалі працу ў інтэрнэце, сацыяльных сетках. Стараюцца, каб перад ад'ездам у Бірштанас у людзей былі ўсе неабходныя звесткі. Якія працэдуры можна атрымаць у санаторыях? Што прапануецца аматарам актыўнага адпачынку, культурных імпрэз? Якія ў рэгіёне гістарычныя помнікі і прыродныя славутасці? Усё гэта і многае іншае (напрыклад, месца назірання за птушкамі, пазнавальныя прыродныя сцежкі) пазначана на інтэрактыўнай карце сайта.

Турцэнтр таксама рыхтуе карты, даведнікі, арганізуе выставы народных умельцаў і іншыя імпрэзы. Усе мерапрыемствы пазначаюцца ў плане, які зацвярджаецца ў мэрыі і фінансуецца мясцовым бюджэтам. Акрамя таго, крыху зарабляе і сам турцэнтр (экскурсіі, продаж сувеніраў), накіроўваючы прыбытак на выданне новых матэрыялаў пра Бірштанас.

А як у нас? У адным з абласных цэнтраў, напрыклад, адкрылі больш за дзесяць турыстычных цэнтраў і пунктаў, і ўсе — пры турфірмах. Быццам і някепска, што без нагрузкі на бюджэт, але...

— Гэта не што іншае, як маркетынгавыя аддзелы канкрэтных арганізацый, ні адна з якіх не будзе прадаваць чужы прадукт. Сапраўдны турцэнтр павінен быць не камерцыйным прадпрыемствам, якое зарабляе на сябе, а працаваць у інтарэсах усяго рэгіёна як інструмент прыцягнення туды адпачывальнікаў і турыстаў. І калі мясцовыя ўлады ў гэтым зацікаўлены, то яны павінны бачыць у турцэнтры не праблему з дадатковымі затратамі бюджэту, а крыніцу даходу для рэгіёна, — лічыць кіраўнік гродзенскай часткі праекта па велатурызме ў літоўска-беларускім памежжы, **намеснік старшыні абласнога аддзялення грамадскага аб'яднання «Рэспубліканскі турысцка-спартыўны саюз» Сяргей КАЛЯДА.**

20 ліпеня ў раёне Аўгустоўскага канала

20 ліпеня ў раёне Аўгустоўскага канала прайшоў трэці міжнародны велапрабег «Суседзі». Каля 500 чалавек з Беларусі, Літвы, Польшчы і Галандыі, у тым ліку і дзеці, спаборнічалі ў 22 намінацыях.

ПРАЕКТАЎ МОЖА БЫЦЬ БОЛЬШ

— Думаю, гэтым участкам веладарожкі мы не абмяжуемся. Будзем імкнуцца злучыць імі новыя мікраараёны, што цяпер будуюцца. Многія жыхары ўжо купляюць веласіпеды, — кажа **намеснік старшыні Ашмянскага райвыканкама Галіна ЛЮТКОЎСКАЯ.**

Дарэчы, у конкурсе па першым праекце трансгранічнага супрацоўніцтва Ашмянам выйграць не ўдалося, аднак на гэтым не спыніліся. Цяпер маюць ужо тры праекты. Акрамя веласіпеднага, разам з Вільнюскім раёнам ажыццяўляецца праект «Дзве краіны — адна гісторыя і культура», у рамках якога робіцца мультымедыйнае афармленне Ашмянскага краязнаўчага музея, набываюцца касцюмы для фестывалю «Гальшанскі замак». А ў партнёрстве з Сувалкамі (Польшча) у Ашмянах пабудуюць летні стадыён.

Праекты трансгранічнага супрацоўніцтва ажыццяўляюцца і ў Гродзенскім раёне. Неабходным абсталяваннем аснашчаны турысцка-інфармацыйны цэнтр у пасёлку Сапоцкін у зоне Аўгустоўскага канала (увогуле дзякуючы беларуска-польскаму праекту «Камунікацыя без межаў» у раёнах вобласці летась створана 7 такіх цэнтраў). Будуецца дарога Гінавічы—Сафіёва з перспектывай стварэння пагранперахода «Сафіёва—Ліпчаны», які дзейнічаў у савецкі час. Робяць дарогу і з польскага боку. Акрамя таго, хаця і праблематычнай, але зусім не фантастычнай бачыцца ідэя веласіпеднай дарожкі паміж Гродна і Друскенікамі. Ужо практычна пройдзены ўзгадненні па адводзе зямлі, прынята рашэнне райвыканкама, паведаміў **намеснік старшыні Гродзенскага райвыканкама Валерый КЛІМОВІЧ.**

Праектаў па міжнародных праграмах добрасуседства можа быць і больш. На думку **дырэктара літоўскага нацыянальнага бюро еўрарэгіёна «Нёман» Гінтараса СКАМАРОЧУСА,** прадстаўнікам рэгіёнаў трэба не чакаць запрашэння да ўдзелу ў тых ці іншых трансгранічных праектах, а самім праяўляць больш ініцыятывы. Пры гэтым, каб паскорыць працэдуры ўзгаднення праектаў, іх маглі б выконваць не ў сталіцы, а ў вобласці, на ўзроўні аблвыканкама. Гэта пойдзе на карысць памежным рэгіёнам, лічыць Гінтарас Скамарочус. Паводле яго інфармацыі, некаторыя праекты ў літоўска-польскім памежжы стартуюць ужо з наступнага дня пасля іх зацвярджэння тэхнічным сакратарыятам праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва: пачынаюцца розныя працэдуры і ў гэты ж час падыходзіць кантракт аб фінансаванні.

Дарэчы, у Літве за праекты трансгранічнага супрацоўніцтва адказвае міністэрства ўнутраных спраў, у Польшчы — міністэрства рэгіянальнага развіцця. Яны, калі трэба, самі робяць запыты ў адпаведныя органы. А вось Гродзенскаму абласному аддзяленню грамадскага аб'яднання «Рэспубліканскі турысцка-спартыўны саюз» для адабрэння праекта па велатурызме, які выйграў у міжнародным конкурсе, давялося звяртацца ў восем рэспубліканскіх інстанцый, прычым не напрамую, а праз аблвыканкам. Хаця чаму б не скарыстацца ўжо выпрабаванай у многіх сферах сістэмай «адно акно», ажыццяўляючы ўсе неабходныя працэдуры праз адно міністэрства? Гэта будзе ў агульных інтарэсах і распрацоўшчыкаў праектаў, і рэгіёнаў, і ўсёй краіны, якая, ствараючы спрыяльныя ўмовы для прыцягнення інвестыцый, больш іх і атрымае.

Барыс ПРАКОПЧЫК

Утерянные представительством Белгосстраха по Центральному району г. Минска бланки страховых полисов по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ №№ 0037431, 0037432, 0037510, бланк квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1СУ серии КС № 1266387 **считать недействительными.** УНП 101883943

СООО «Восточная строительная компания», застройщик объекта «14-16-этажный жилой дом типовых потребительских качеств № 26 (по генплану) в микрорайоне Каменная горка-5» (жилой дом «Акцент»), сообщает о проведении собрания и приглашает дольщиков данного объекта принять в нем участие.

Собрание состоится на строительной площадке объекта 31.07.2013 в 10.00. УНП 190565789

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Аукцион состоится 27.08.2013 г. в 10:00 по адресу: 210600, г. Витебск, пр-т Черняховского, 19, конференц зал.

Организатором аукциона является РУП «Белтелеком» в лице Витебского филиала РУП «Белтелеком», находящегося по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, 19.

На аукционе выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества:

Лот 1. Помещение 2-го этажа здания, расположенного по адресу: ул. Якуба Коласа, 14 в г. Новополоцке Витебской области, удовлетворительного состояния, общей площадью 12,3 кв.м, срок аренды – не менее 3-х лет; начальная цена продажи – 3,075 базовых арендных величин (далее БАВ); размер задатка – 0,3075 БАВ, коэффициент (п. 8.2 Указа №150) составляет 1,5.

Лот 2. Помещение 4-го этажа здания, расположенного по адресу: ул. Якуба Коласа, 14 в г. Новополоцке Витебской области, удовлетворительного состояния, общей площадью 34,8 кв.м, срок аренды – не менее 3-х лет; начальная цена продажи – 8,7 БАВ; размер задатка – 0,87 БАВ, коэффициент (п. 8.2 Указа №150) составляет 1,5.

Лот 3. Помещение 4-го этажа здания, расположенного по адресу: ул. Якуба Коласа, 14 в г. Новополоцке Витебской области, удовлетворительного состояния, общей площадью 47,3 кв.м, срок аренды – не менее 3-х лет; начальная цена продажи – 11,825 БАВ; размер задатка – 1,1825 БАВ, коэффициент (п. 8.2 Указа №150) составляет 1,5.

Лот 4. Помещение 4-го этажа здания, расположенного по адресу ул. Якуба Коласа, 14 в г. Новополоцке, Витебской области, удовлетворительного состояния, общей площадью 36,8 кв.м, срок аренды – не менее 3-х лет; начальная цена продажи – 9,2 БАВ; размер задатка – 0,92 БАВ, коэффициент (п. 8.2 Указа №150) составляет 1,5.

Лот 5. Помещение 4-го этажа здания, расположенного по адресу: ул. Якуба Коласа, 14 в г. Новополоцке Витебской области, удовлетворительного состояния, общей площадью 16,9 кв.м, срок аренды – не менее 3-х лет; начальная цена продажи – 4,225 БАВ; размер задатка – 0,4225 БАВ, коэффициент (п. 8.2 Указа №150) составляет 1,5.

Лот 6. Помещение на 3-м этаже здания, расположенного по адресу: ул. Якуба Коласа, 14 в г. Новополоцке Витебской области, общей площадью 141,2 кв.м, удовлетворительного состояния, срок аренды – не менее 3-х лет; начальная цена продажи – 35,3 БАВ; размер задатка – 3,53 БАВ, коэффициент (п. 8.2 Указа №150) составляет 2,0.

Первоначально извещение о проведении открытого аукциона опубликовано в газете «Звязда» №225 от 22.11.2012 г., №55 от 26.03.2013, № 39 от 28.02.2013, № 78 от 26.04.2013.

Лот 7. Помещение на 3-м этаже здания, расположенного по адресу: ул. Якуба Коласа, 14 в г. Новополоцке Витебской области, общей площадью 34,9 кв.м, удовлетворительного состояния, срок аренды – не менее 3-х лет; начальная цена продажи – 8,725 БАВ; размер задатка – 0,8725 БАВ, коэффициент (п. 8.2 Указа №150) составляет 3,0.

Предполагаемое целевое использование – для производственных целей (за исключением вредных производств), размещения офисов, складского помещения, оказания услуг, осуществления розничной торговли.

Документы на участие в аукционе принимаются с 27.07.2013 г. по 26.08.2013 г. в рабочее время (с 9:00 до 17:00), по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, 19, каб. 509-п. Документы, поданные после 17:00 26.08.2013, не рассматриваются. Заключительная регистрация участников аукциона в день проведения аукциона с 9:00 до 10:00 по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, 19, каб. 509-п.

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 №1049.

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе:

- перечисляет задаток на с/с №3012072841543 в филиале №200 – Витебском областном управлении ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 150801635, УНП 300977657 Витебский филиал РУП «Белтелеком»;
- подает заявление на участие в аукционе;
- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;
- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:

- физическое лицо предъявляет документ, удостоверяющий личность;
- индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации;
- юридическое лицо (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на субсчет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона.

Срок заключения договора аренды: не менее 3-х лет.

Телефоны для справок: (0212) 27 29 42, 27 11 58, факс (0212) 27 18 81.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении внеочередного общего собрания акционеров

Внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Белэнергозащита»
состоится 13 августа 2013 года в 11 часов 00 минут по месту нахождения общества: г.Минск, пер.Бехтерева, 7, актовый зал ОАО «Белэнергозащита».

Собрание проводится в очной форме. Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, осуществляется в день проведения собрания по месту (адресу) проведения собрания. Время начала регистрации: 10 часов 00 минут. Время окончания регистрации: 10 часов 45 минут.

Дата формирования реестра владельцев акций общества, на основании которого будет составлен список лиц, имеющих право на участие в собрании: 7 августа 2013 года.

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

1. Об утверждении дивидендов за первое полугодие 2013 года.
2. О внесении изменений в устав ОАО «Белэнергозащита», утвердив его в новой редакции.

Ознакомление лиц, имеющих право на участие в собрании, с информацией (документами), подлежащими предоставлению при подготовке к проведению собрания, будет осуществляться в рабочие дни и рабочее время с 30 июля 2013 года по 12 августа 2013 года по адресу: г. Минск, пер. Бехтерева, 7, комн. 301, а в день проведения собрания – во время и в месте проведения собрания.

Для регистрации участнику собрания необходимо предъявить документ, удостоверяющий личность, а также, если необходимо, документы, подтверждающие его полномочия: доверенность и/или другие документы в соответствии с действующим законодательством.

Наблюдательный совет ОАО «Белэнергозащита»

УНП 100098854

Вниманию акционеров!
ОАО «Стройтрест № 3 Ордена Октябрьской революции»
извещает своих акционеров о проведении «31» июля 2013 года внеочередного собрания акционеров.

Повестка дня:

1. О приобретении находящегося в собственности Минской области в хозяйственном ведении Минского областного унитарного предприятия «Слуцкая укрупненная типография» (УП «Слуцкая укрупненная типография» изолированного помещения (инвентарный номер 644 D-29606), расположенного по адресу: Минская область, г. Солигорск, ул. Козлова, 37 и имущества типографии.
2. О размере и сроках выплаты дивидендов по итогам работы Общества за 1 полугодие 2013 года.
3. О внесении изменений в Устав Общества.

Собрание состоится по адресу: г. Солигорск, ул. Козлова, 37, актовый зал (2 этаж) в 17.00.

С проектом решения собрания акционеры могут ознакомиться по адресу: г. Солигорск, ул. Козлова, 37 в кабинете № 309 с 29 июля по 31 июля 2013 г. с 10.00 до 16.00 (перерыв на обед – с 13.00 до 14.00), а в день проведения собрания – в актовом зале стройтреста № 3 (2 этаж).

Регистрация участников собрания будет производиться с 16.45 по предъявлению документа, удостоверяющего личность, а для представителей акционеров – по доверенности.

УНН 600122771 **Наблюдательный Совет**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 12 сентября 2013 г. ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ
по продаже конфискованного имущества

Предмет торгов (наименование, местонахождение, характеристики продаваемого имущества)	Гараж № 110А общей площадью 32,4 кв. м, расположенный по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 127, ГПК «Курасовщина-1»
Начальная цена	70 429 000 белорусских рублей
Сумма задатка	7 000 000 белорусских рублей
Организатор аукциона	УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, (017) 327 40 22

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет №3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион проводится 12 сентября 2013 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с 26.07.2013 по 10.09.2013 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефон для справок: (017) 327 40 22 – УП «Минский городской центр недвижимости».

З ЛЮБОЎЮ ДА ЛЮДЗЕЙ

Славуты старажытны абраз Баркалабаўскай Божай Маці прадставяць гасцям Дня пісьменства ў Быхаве 1 верасня. Пра гэта дамовіліся мясцовыя ўлады і духавенства, і расказалі пра такія планы на свяце ў Баркалабаве.

24 ліпеня ў Быхаўскім раёне, паводле старадаўняй традыцыі, ушанавалі **абраз Баркалабаўскай Божай Маці.** Ён захоўваецца ў Свята-Увазнясенскім жаночым манастыры, што паблізу аграгарадка Баркалабава.

У гэты дзень манастыр наведалі сотні вернікаў. Яны прыехалі на аўтамабілях, веласіпедах, вазах. А таксама прыйшлі і пешшу хрэсным ходам — з Магілёва і Быхава. Вітаючы гасцей, у манастыры выклалі з кветак дарожку. Нягледзячы на дождж, каля галоўнага храма стаяла шмат людзей: унутры, дзе вёў службу епіскап Магілёўскі і Мсціслаўскі Сафроній, усім не хапіла месца. Вернікі на вуліцы пад парасонамі, схаваўшы абразы пад плёнку, слухалі трансляцыю службы.

Абраз Баркалабаўскай Божай Маці, убраны з нагоды свята ружамі, асвятлялі ў храме свечкі і лампады. Аднак дабрацца да самога абраза праз натоўп было няпроста. Кожны хацеў дакрануцца да старажытнай каштоўнасці, якая робіць вялікае ўражанне.

Гэтаму абразу больш за 350 гадоў, і ён мае цікавую гісторыю. Выяву Божай Маці падараваў манастыру ў 1659 годзе князь Пажарскі. Паводле падання, вайсковы абоз князя не здолеў крануцца з месца пасля прыпынку ў манастыры, пакуль Пажарскі не пакінуў прыгожы абраз у Баркалабаве.

Калі манастыр у савецкі час закрылі, каштоўнасць захоўвалі манашкі і простыя людзі, а пасля вайны перадалі ў царкву ў Быхаў. У 2010 годзе, калі ў Баркалабаве аднавілі манастыр, абраз Божай Маці, які вернікі шануюць як цудатворны, вярнуўся на сваю радзіму. І штогод, 24 ліпеня, тут адзначаюць яго прастольнае свята.

— Я радуюся, — сказаў пра свае пачуцці **настаяцель Свята-Троіцкай царквы ў Быхаве айцец Мікалай.** — І прасіў бы, каб мы сталі больш спагадлівыя і цярпімыя адно да аднаго, каб прымалі і любілі людзей. І гэта магчыма.

— Баркалабава — цудоўнае месца, — падзялілася Антаніна з Гомельскай вобласці. — І мне падабаецца свята, якое не сапсаваў і дождж, летні і цёплы.

— Для мяне тут роднае месца, таму што маці адсюль родам, — сказала Алена. — Я прашу ў Баркалабаўскай Божай Маці дабрабыту і міру.

— Абраз прыгожы і нясе добрасць, — сказаў Аляксандр з Быхава. — Не кожнаму выпадае пабачыць такую легендарную старажытнасць, таму я горды, што я тут быў і стаяў побач. І я прашу здароўя для сябе і сваякоў, для ўсіх.

На свяце ў Баркалабаве пабываў і кіраўнік свецкай улады Быхаўскага раёна. **Старшыня райвыканкама Дзмітрый КАЛЕЕЎ** сказаў, што рады вітаць усіх гасцей.

— Я ганаруся, што праз такую падзею становіцца вядомай быхаўская зямля, — пракаментаваў ён. — Многія знаходзяць тут суцяшэнне і радасць, і мяне гэта, як кіраўніка раёна, радуе. У часіны, калі навокал адбываюцца войны, разнастайныя катаклізмы, стыхійныя бедствы, нам усім трэба не страціць любоў да блізкага, да працы, да сям'і і да ўсяго навокал нас, каб не страціць саміх сябе.

Дзмітрый Калееў пацвердзіў, што абраз Баркалабаўскай Божай Маці змогуць пабачыць госці Дня беларускага пісьменства. Для гэтага каштоўнасць часова перавязуць з Баркалабава ў Свята-Троіцкую царкву ў раённым цэнтры. Гэта стане адной з адметнасцяў свята, якое адбудзецца ў Быхаве 1 верасня.

Ілона ІВАНОВА. Фота аўтара.
Быхаўскі раён.

МЕНЕЙ ЗЛАЧЫНСТВАЎ, УЧЫНЕНЫХ ІНШАЗЕМЦАМІ

У Віцебску адбылася міжнародная рабочая сустрэча пракурорскіх работнікаў Пскоўскай і Віцебскай абласцей па пытанні ўзаемадзеяння праваахоўных органаў прыгранічных рэгіёнаў у сферы барацьбы з незаконнай міграцыяй і гандлем людзьмі. У сустрэчы бралі ўдзел пракуроры Віцебскай і Пскоўскай абласцей, кіраўнікі структурных падраздзяленняў пракуратур, пракуроры шэрагу прыгранічных раёнаў.

Сёння ў Віцебскай вобласці на ўліку ў падраздзяленнях па грамадзянстве і міграцыі знаходзіцца больш за 24 тысячы замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць у Прыдзвінскім краі. У апошнія гады павялічваецца агульная колькасць асоб, якія прыязджаюць у Беларусь. Зразумела, гэтаму спрыяюць існуючы памежны рэжым і гандлёва-мытная палітыка. І нярэдка працэс незаконнага перамяшчэння грамадзян носіць не стыхійны характар, а арганізаваны грамадзянамі, якія ажыццяўляюць незаконную міграцыю па адпрацаванай схеме.

— Так, у красавіку бягучага года на тэрыторыі Віцебскай вобласці быў затрыманы грамадзянін Беларусі, які арганізаваў незаконны ўезд з тэрыторыі Расіі 6 грамадзян В'етнама і двух — Афганістана, — паведаміла **Ірына Таўтын, старшы памочнік пракурора Віцебскай вобласці па прававым забеспячэнні, інфармацыі і грамадскіх сувязях.** — Таксама сёлета УКДБ па вобласці сумесна з УФСБ Расіі па Смаленскай вобласці ажыццёўлены комплекс мераприемстваў, у выніку якіх быў перакрыты канал незаконнага ўезду грамадзян Грузіі ў Расію з Беларусі. Арганізатар канала, жыхар Смаленскай вобласці, прыцягнуты да крымінальнай адказнасці ў Расіі...

Эфектыўна наладжаны кантроль за знаходжаннем замежных грамадзян на тэрыторыі Віцебскай вобласці і іншыя прафілактычныя захады дазволілі знізіць колькасць злачынстваў, учыненых іншаземцамі. У прыватнасці, летась іх было зарэгістравана 140. Для параўнання: у 2011 годзе — 205, а за 6 месяцаў бягучага года — 68.

У ходзе рабочай сустрэчы была нададзена ўвага праблеме, звязанай з гандлем людзьмі, у тым ліку незаконнаму вывазу жанчын у іншыя дзяржавы з мэтай сексуальнай эксплуатацыі.

Былі абмеркаваны таксама пытанні працоўнай эксплуатацыі незаконных мігрантаў. Эфектыўным механізмам прафілактыкі нелегальнай міграцыі і гандлю людзьмі з'яўляецца ліцэнзаванне дзейнасці, звязанай з прыцягненнем замежнай працоўнай сілы. Так, сёлета на тэрыторыі Віцебскай вобласці функцыянуюць 94 такія суб'екты гаспадарання, большасць з іх (38) — у Віцебску. Акрамя таго, ёсць 4 уладальнікі ліцэнзіі на ажыццяўленне дзейнасці, звязанай з працаўладкаваннем беларускіх грамадзян за мяжой.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

«Бе-La-Русь» зноў сабрала сяброў

25 ліпеня пачаў працу XXII Міжнародны моладзевы лагер «Бе-La-Русь», які размясціўся на тэрыторыі Верхнядзвінскага раёна, каля Кургана Дружбы, на стыку межаў Беларусі, Латвіі і Расіі.

Ідэйнымі натхняльнікамі праекта традыцыйна выступаюць грамадскія аб'яднанні: «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі», «Саюз за прагрэс моладзі Латвіі», агульнарасійская грамадская арганізацыя «Расійскі саюз моладзі». Кожны год гаспадыняй лагера становіцца адна з гэтых трох моладзевых арганізацый — заснавальнікаў лагера «Бе-La-Русь». Сёлета — беларускі бок.

Асноўная тэматыка працы лагера — «100 ідэй для «Бе-La-Русь 2013».

Маладыя людзі і дзяўчаты бяруць удзел у розных творчых і спартыўных конкурсах: бівуакаў, «Горад ідэй «Бе-La-Рускія забавы», творчым фэсце «Бе-La-Рускія зоры»...

Цікава, што будзе выбрана «Лепшая пара Бе-La-Русі». А для вызначэння стылістыкі пар прапануюцца наступныя вобразы: Таццяна і Анегін; Рамэа і Джульета; Боні і Клайд; Клеапатра і Марк Антоній; Карлсан і Фрэкен Бок; Джэйкаб і Бэла.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

РЫХТУЕЦЦА ДАВЕДНІК НАЙМЕННЯЎ ДЗЯРЖАЎ І ТЭРЫТОРЫЙ СВЕТУ

Падобны даведнік з'явіцца ў Беларусі ўпершыню. Ён паслужыць унікальным інфармацыйным рэсурсам для напісання найменняў дзяржаў і тэрыторый свету, іх сталіц і цэнтраў на трох мовах.

Таксама ў ім будуць прыведзены дзве афіцыйныя формы напісання — кароткая (яна, як правіла, выкарыстоўваецца ў картаграфічных творах) і поўная (часам — абрэвіятура). У выпадках, калі афіцыйная кароткая форма назвы не супадае з назвай, прынятай для адлюстравання ў картаграфічных творах з улікам існуючай практыкі, будзе паказана і назва, якая выкарыстоўваецца ў картаграфіі. Калі ж у дзяржавы або тэрыторыі існуе другое найменне, якое часта ўжываецца, яно будзе дадзена ў дужках з паметкай варыянта. Напрыклад, Бермудскія астравы (Бермуды). Для кожнай дзяржавы і тэрыторыі ў даведніку найменняў дзяржаў і тэрыторый свету лічыцца абавязковым указанне іх геаграфічнага становішча і статусу.

За аснову напісання найменняў на рускай і англійскай мовах былі ўзяты даныя (спісы) ААН. На беларускую мову назвы перакладзены з рускай мовы ў адпаведнасці са спецыяльнай тэхнічнай інструкцыяй.

Выданне прызначана для дзяржаўных органаў, іншых арганізацый, грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, якія ажыццяўляюць картаграфічную дзейнасць. Устаноўленыя ў даведніку адзіныя формы напісання найменняў дзяржаў і тэрыторый свету, іх сталіц і цэнтраў на рускай, беларускай і англійскай мовах накіраваны на забеспячэнне стандартызацыі ў галіне геаграфічных найменняў свету для паказу ў картаграфічных і іншых творах. Звесткі прыведзены па стане на 1 студзеня 2013 года.

Сяргей КУРКАЧ.

ЛУТКУ ДАПАМАГЛІ Ў «БЕЛЫМ»

У Беларусі павялічваюць колькасць аднаго з самых рэдкіх у рэспубліцы відаў птушак — лутка, паведаміў карэспандэнту БЕЛТА загадчык сектара міжнароднага супрацоўніцтва і навуковага суправаджэння прыродаахоўных канвенцый Дзяржаўнага навукова-вытворчага аб'яднання «Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па біярэсурсах» кандыдат біялагічных навук Аляксандр Казулін.

У мэтах захавання беларускай папуляцыі лутка ў 2012 годзе была зроблена спроба засяліць ім штучныя гняздоўі. Для гэтага на тэрыторыі рыбгаса «Белае» ў рамках праекта ПРААН / ГЭФ «Біяразнастайнасць» было ўсталявана 30 штучных гняздоўяў (дуплянак) для гэтай птушкі. Эксперымент аказаўся ўдалым.

Пры паўторнай устаноўцы штучных гняздоўяў плануецца змяніць іх канструкцыю. «На сажалках рыбгаса «Белае» высокая колькасць і іншага віду, які таксама гняздуецца ў дуплах, — гогаля, які таксама селіцца ў штучных дуплянках», — сказаў Аляксандр Казулін, падкрэсліўшы, што гогаль крыху буйнейшы за лутка, таму варта адрэгуляваць адтуліну ў дуплянцы такім чынам, каб залазіць у яе мог толькі больш дробны луток. Не менш важнай задачай з'яўляецца ўстаноўка на дуплянках эфектыўнай абароны ад куніц — асноўнага драпежніка для птушак-дуплагнездавікоў.

Паводле слоў вучонага, на тэрыторыі Беларусі адзіным ізаляваным участкам рэгулярнага гнездавання віду з'яўляюцца сажалкі рыбгаса «Белае» (Жыткавіцкі раён): там жыве прыкладна 15-30 пар лутка.

Луток, або малы крахаль, — вадаплаўная птушка сямейства качыных з бела-пярэстым апярэннем. Сучасная вобласць гнездавання лутка размешчана ў тайговай зоне Заходняй Палеарктыкі ад Швецыі да Камчаткі. Беларусь — адзіная дзяржава, дзе захавалася ізаляванае ад асноўнага арэалу паселішча лутка.

Луток уключаны ў Чырвоную кнігу Беларусі. Адзінаму месцу на тэрыторыі рэспублікі, дзе жыве птушка, рыбгасу «Белае», нададзены міжнародны ахоўны статус — тэрыторыя, важная для птушак.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
по продаже земельных участков в частную собственность для индивидуального жилищного строительства в д. Завадино, д. Заславки, д. Несино Лепельского района Витебской области

Организатор: Бобровский сельский исполнительный комитет

Лот	Месторасположение земельного участка, его площадь и кадастровый номер	Целевое назначение земельного участка	Условия и ограничения, инженерно-геологические условия	Расходы по подготовке и изготовлению документации	Начальная цена, рублей	Сумма залога, рублей
1.	д. Завадино, площадь 0,2200, кадастровый номер 222782503301000037	Для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома)	2. Водоохранная зона водных объектов вне прибрежных полос (озеро Мугирино) 6. Охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В	1323170	3000000	300000
2.	д. Заславки, площадь 0,2165 кадастровый номер 222782504701000035	Для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома)	2. Водоохранная зона водных объектов вне прибрежных полос (озеро Урода) 6. Охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В	3045644	3000000	300000
3.	д. Несино, площадь 0,2126 кадастровый номер 222782507101000058	Для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома)	2. Водоохранная зона водных объектов вне прибрежных полос (озеро Несино) 6. Охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В	1109297	3000000	300000

**** инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ.***

1**. Аукцион состоится 30 августа 2013 года в 14.00 по адресу: Витебская обл., Лепельский р/н, аг. Боброво, ул. В. Маргевич, д. 9.**

2. Заявления от граждан Республики Беларусь на участие в торгах принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: Витебская обл., Лепельский район, аг. Боброво, ул. В. Маргевич, д. 9.

Последний день приема заявлений 26 августа 2013 года.

3. Для участия в аукционе необходимо предоставить копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенную доверенность, а также предъявляется паспорт или иной документ, удостоверяющий личность и копии платежных документов, подтверждающих уплату залога.

Сумма залога перечисляется до подачи заявления на расчетный счет 3641319011010 в ЦБУ № 211 филиала № 214 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Лепель, ул. Гагарина-1, МФО 660, УНП 300039760.

Получатель – Бобровский сельский исполнительный комитет.

4. Не допускается начало торгов по начальной цене.

5. Оплата стоимости предмета аукциона, расходов по организации и проведению аукциона, расходов на подготовке и изготовлению документации, расходов на публикацию в средствах массовой информации, подлежащих возмещению победителем, осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами и земельным участком в натуре.

Контактные телефоны: 8 (02132) 2 91 38, 2 91 45; 8 (029) 1333102.

Уважаемые акционеры ОАО «Завод «Белпласт»!
27 августа 2013 года в 14.00
состоится внеочередное общее собрание акционеров
по адресу: г. Минск, ул. Гусовского, 2, ОАО «Завод «Белпласт».

Повестка дня собрания:

1. Внесение изменений и дополнений в Устав ОАО «Завод «Белпласт».
2. Об участии ОАО «Завод «Белпласт» в холдинге «ПромЭнергоБаланс» путем заключения договора с управляющей компанией ООО «ПромЭнергоБаланс».
3. О досрочном прекращении полномочий члена наблюдательного совета Логовской А.В.

Регистрация участников собрания проводится в день собрания в приемной ОАО «Завод «Белпласт» (2 этаж) с 13.00 до 13.45.

Акционерам необходимо иметь при себе документ, удостоверяющий личность.

Представителю акционера – доверенность и документ, удостоверяющий личность.

УНП 100008342 **Наблюдательный совет ОАО «Завод «Белпласт».**

Утерянный сертификат ЦТ 2013 г. по биологии на имя Пышинского Ивана Ивановича **считать недействительным.**

Уважаемые акционеры ОАО «Дрожжевой комбинат»!
20 августа 2013 года в 15.00
проводится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Дрожжевой комбинат»
по адресу: г. Минск, ул. Октябрьская, 14 (актовый зал).

Повестка дня:

1. О выплате дивидендов по итогам работы за 1 полугодие 2013 года.

Регистрация участников собрания будет производиться с 14.00 по 14.50 по предъявлении документа, удостоверяющего личность, а для представителей акционеров – по доверенности.

Администрация
УНП 100104781 **Наблюдательный совет**

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ по продаже земельного участка в собственность в г. Гродно

№ лота	наименование объекта	местонахождение объекта	площадь земельного участка (га)	кадастровый номер	Расходы по подготовке земельно-кадастровой документации (руб.)	начальная цена продажи (руб.)	сумма задатка (руб.)
1.	Земельный участок У-254*	м-н «Заболоть»	0,0996	440100000002007417	2 647 617	57 914 611	6 000 000

Аукцион состоится 15 августа 2013 года, в 16.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1. Заявления на участие в аукционах принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, каб. №61, в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 **с 29 июля по 9 августа 2013 г.** Подробная информация в газетах «Гродненская правда» №64 от 06.06.2013 г. и «Звязда» №102 от 06.06.2013 г.

Телефон для справок в Гродно: (0152) 720546.
Адрес сайта: **www.grodno.gov.by.**

Зёлкавы водар на свяце лета

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Свят на Любаншчыне хапае. У тым ліку і тых, якія дайшлі да нас са старажытнасці, — кажа начальнік аддзела культуры, ідэалогіі і па справах моладзі Любанскага райвыканкама Васіль КАТКАВЕЦ. — Але мы хочам прывіць жыхарам нашых аграгарадкоў цікавасць да сваіх вытокаў, выхоўваць у іх пачуццё гонару за захаваныя старэйшымі пакаленнямі традыцыі, за непаўторную спадчыну ад сваіх бабуль. Фестываль «Аграфэст» ставіць за мэту выяўленне самабытных людзей і самабытных традыцый, звычаяў, абрадаў, надання ім новага дыхання і жыцця ў сучасных умовах — своеасаблівай сацыялізацыі назапашанай продкамі духоўнасці. А гэтым наш край сапраўды багаты.

На працягу года на Любаншчыне пройдзе яшчэ шэсць фестывальна-святочных дзён. Распарацавана і зацверджана цэлая праграма. Напрыклад, 28 ліпеня ў аграгарадку Малыя Гарадзяцічы пройдзе свята «Букетам кветак маніць палісад», а 11 жніўня ў Асаўцы правядуць «Дрэва жыцця». Увосень у Талі, Соснах і Сарачах прашумяць свае святы-конкурсы.

На Дзень лета ў Рэчані завіталі народныя майстры — саломапляцельшчык Уладзімір Ціханоўскі, выдатная ткачыха паясоў Святлана Адзінец, вышывальшчыца ікон Галіна Чарнышова. Ігралі гармонікі. На адным — любанец Васіль Семашкевіч, а на другім... жыхарка Вільні Рыта Шукіене. Прыгатаванымі загадзя напоямі частавалі ўдзельнікаў свята жанчыны-траўніцы з народнага клуба народных традыцый вёскі Сосны-1.

Але сапраўднай цікавінкай рачэньскага аграфэсту сталі зёлкі, сабраныя і прыгатаваныя на вогнішчы 80-гадовай Зоняй Рудзько. Яна кідала ў кіпень кветкі ліпы, святаяннік, чабор... Прызнаецца, што не чакала гэткага ажыятажу. Ахвотных пакаштаваць напой (які, дарэчы, ёй давялося гатаваць некалькі разоў запар) было вельмі шмат..

Анатоль КЛЯШЧУК.
Фота аўтара.

Даты. Падзеі. Людзі

Дзень сістэмнага адміністратара — прафесійнае свята адміністратараў карпаратыўных і хатніх сетак, паштовых сістэм, праграмных комплексаў. Адзначаецца ў апошнюю пятніцу ліпеня.

1600 год — нарадзіўся Гіём Баплан, французскі інжынер-фартыфікатар. У 1630-1648 гадах служыў у арміі Рэчы Паспалітай у чыне капітана артылерыі. Пабудаваў шэраг крэпасцяў. Падчас шматлікіх падарожжаў сабраў багаты гістарычны, геаграфічны і этнаграфічны матэрыял, які пазней апублікаваў. Гіём Баплан таксама стварыў карты сучасных тэрыторый Беларусі, Літвы, Польшчы і Украіны, якія неаднаразова друкаваліся ў розных варыянтах да сярэдзіны XVIII ст. і цяпер з'яўляюцца важнымі гістарычнымі дакументамі. У карце «Вялікае Княства Літоўскае і Белая Русь» упершыню ў гісторыі картаграфіі назва «Беларусь» вынесена ў загаловак. Памёр у 1673 годзе.

1931 год — нарадзіўся (вёска Слабада Мазырскага раёна Гомельскай вобласці) Леанід Іванавіч Калыхан, беларускі вучоны ў галіне ядзернай энергетыкі, член-карэспандэнт НАН Беларусі (1984). Аўтар больш за 100 навуковых прац, у тым ліку 3 манаграфій, 45 вынаходак. Вывучаў цеплаабмен і гідрадынаміку ў мадэлях і макетных узорах цеплаабменнага абсталявання і элементах актыўнай зоны рэактараў АЭС. Распрацаваў навукова-тэхнічныя асновы стварэння пасіўных сістэм бяспекі для АЭС новага пакалення.

1959 год — Рычард Ніксан, тады яшчэ віцэ-прэзідэнт Злучаных Штатаў, знаходзіўся з візітам у Савецкім Саюзе. На-

двор'е стаяла выдатнае, і пасля перамоў савецкі лідар адправіўся з высокім амерыканскім госцем на шпацыр па Маскве-рацэ. На яе берагах было шмат адпачывальнікаў. І Мікіта Хрушчоў, радуючыся такой карціне, увесь час звяртаўся да Ніксана з адным і тым жа пытаннем: «Ну што — падобныя гэтыя людзі на рабоў камунізму?».

Было сказана

Браніслаў ТАРАШКЕВІЧ, пісьменнік, літаратуразнавец, публіцыст, вучоны-моваznавец, грамадскі дзеяч, акадэмік НАН Беларусі:

«Гук, літара — гэта толькі цень, а слова — кроў і косць, жывое цела ў нашых душах, дарагое, майстэрскае начынне — у ім наш духоўны набытак».

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй міжнароднага арбітра Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

КАЛЕКЦЫЯНЕР

Аляксандр Палявы (на фота) яшчэ ў савецкія часы стаў вядомым складальнікам задач. Потым з Кіргізіі пераехаў на пастаяннае месца жыхарства ў Ізраіль, дзе захапіўся ідэяй стварэння электроннай картатэкі. Для гэтай мэты набыў праграму «Аўрора», і цяпер у яго адна з самых багатых баз — і не толькі задач, але і праблем, эцюдаў. Яна дапамагае яму высвятляць у кампазіцыях пабочныя разгалінаванні і супадзенні, іншыя акалічнасці. Напрыклад, звярнуў увагу, што заданне аўтарскага конкурсу-17/6 мае шмат агульнага з эцюдам, змешчаным у анталогіі Л. Вітошкіна, ч. 5, дыяграма 1094.

Для форума «МіФ» на сайце калекцыянер падрыхтаваў праблему на 100-клетачнай дошцы, складзеную ім сумесна з вядучым рубрыкі. Пазнаёмцеся з ёю:

Белыя: 9, 11, 14, 19, 24, 29, 41, 49 (8). **Чорныя**: 8, 28, 32, 33, 36, 38, 40 (7). Знішчэнне дзвюх чорных дамак (!): 7, 43, 27, 3, 35, 4x.

ТРЭЦІ ТУР

Яго заданні падаём у конкурсе-17 Пятра Шклудава (Наваполацк). У іх белыя пачынаюць і выйграюць:

№ 17/7. **Белыя**: c1, e1, e5, дамка a3 (4). **Чорныя**: a5, b2, c3, e3, g7, дамка f8 (6).

№ 17/8. **Белыя**: a7, d2, d4, e3, e5, f4, g3, g5, h4 (9). **Чорныя**: b2, b4, b6, c5, c7, e7, f8, g7, h2 (9). Выпраўленне пазіцыі В. Шрамко і М. Фясенкі.

№ 17/9. **Белыя**: a3, c1, c7, d2, d6, e1, e5, e7, f4, h6 (10). **Чорныя**: a5, b2, b4, b8, c3, c5, d4, e3, f8, g3, g5, h2 (12).

Дарэчы, лаўрэаты аўтарскіх конкурсаў 13, 15 і 16 заахвочаны з прызавога фонду П. Шклудава. Сярод іх: Аляксандра Камінская (Вілейка), Уладзімір Валчкоў (Маладзечна), Уладзімір Бандарык (в. Лугавая Слабада Мінскага раёна), Аляксандр Белы (Наваполацк), Аляксандр Перавознікаў (Рагачоў), Сяргей Нячаеў (Баранавічы), Віктар Талкачоў (в. Уздзевічы Клімавіцкага раёна), Ігар Ананіч (Гродна), Альберт Літвінаў (Мінск).

Нам прыемна паведаміць, што ФМЖД прысвоіла П. Шклудаву, а таксама Аляксандру Кагоцьку (Пінск), Аляксандру Сапегіну (Усполле Мсціслаўскага раёна) і Анатолю Шабаліну (Мінск) званні міжнародных майстроў.

Прадстаўнікі Беларусі добра выступілі і ў 5-м асабістым першынстве свету па складанні вялікіх камбінацыйных праблем-100. У першую дзясятку трапілі П. Шклудаў (шостае месца), Р. Краўцоў з Магілёўскай вобласці (сёмае), В. Шульга з Мінска (дзявятае) і А. Сапегін (дзясятае). Кваліфікацыйныя ачкі заваявалі: П. Шклудаў — за 2-е месца ў катэгорыі Д і Р. Краўцоў — за трэцяе ў катэгорыі А. Званні чэмпіёна ўдастоены В. Моркус (Літва).

❍ ❍ ❍ ❍

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас:

220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».

РАШЭННІ

Аўтарскі-17 (П. Шклудаў): № 1 — d8, c5, c7, g1+, № 2 — g3, gf2, ed8, c1, e7, g7, f2, d2!+, № 3 — b6, d8, h4, d4, c1 (f4) g5, f2+, № 4 — d8, h4, c5, c7, g1 (a1) b2, c3+, № 5 — a5 (e5A) e1 (b6B) f6 (g7) a7 (c7) b8 (b6) h4 (d2) e5, e1+. A(c5) c3, f6, b8+. B(f4) c3, f8, b8+ і № 6 — h4 (d8AB) fg5 (e3) e5(c5CDE) gf6, a3 [Врагоў, 1917] (f2F) g3, d6+. A(h8) f6+. B(e5) d6 (c5) b4, f6 (e3) a1/b2 (f2G) g3+. C(d2) c3, f6, a3+. D(e7) d4, f6, a3+. E(f2) e1, e5-g3+. F(d2) c3+. G(d2) c3+.

«Пагода ў доме» (М. Грушэўскі): № 9/17 — g7 (f2A) c7 (d4) f8 (g5B) c1, e1x. B(c5) h4, a1x. A(g5) c7 (d4) f8 (f2C) e1x. C(c5) e1, a1x, № 9/18 — c3 (d2A) e3 (d2B) d8 (e5C) d8:h8x. C(e7) d8:h4:h8x. B(e7) d8, d8:h4:h8x. A(e7) d8, e3!, d8:h4:h8x, № 9/19 — b8, f8, g5, c7, c1 (a5/c5) c3x, № 9/20 — g5, f8, c1 (d6) cd2 (c7A) a5, h6x. A(f6) h6, b6/a5x, № 9/21 — e7 (d:d4AB) h8, d8 (de1C) a5x. C(fe1) h4x. B(h:h8) c3, c3:d8:c3/c3:e1:c3x. A(h:d4) h8, d8x і № 9/22 — d8, ab6 (e7A) d8:h4:e1:c3:a1, h4x. A(g5) d8:h4:e1:c3:a1, d8x.

■ Інфарм-укол

У курца не можа быць здаровых сасудаў

Нікацін найперш наносіць шкоду сасудам. Яны рэзка звужаюцца, і кровазварот парушаецца. Пры гэтым падобныя працэсы адбываюцца не толькі з буйнымі артэрыямі, сасудамі галаўнога мозга — пакутуюць і вельмі дробныя, якія забяспечваюць харчаванне і дастаўку кісларoду да тканак вачэй. Паступова гэта прыводзіць да паталогіі ў вочных тканках. У курцоў значна вышэй рызыка набыць узроставае захворванне вачэй.

Паводле слоў **інструктара-валеолага 23-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Ірыны ШЫМАНСКАЙ,** цяпер дакладна вядома, што той, хто працуе або жыве побач з курцамі, таксама павышае сваю рызыку набыць захворванні, уласцівыя курцам, — сардэчна-сасудзістыя, анкалагічныя, органаў дыхання, страўнікава-кішачнага тракту, коснай сістэмы, вачэй, скуры. Тытунёвы дым — магутны алерген. У таго, хто знаходзіцца ў пракураным памяшканні, можа развіцца алергічны кан'юнктывіт. Небяспечны нікацін і для «пасіўных» цяжарных. А рызыка развіцця раку лёгкіх пры «пасіўным курэнні» ў членаў сям'і курца павышаецца больш як у 3 разы. Экалагічная небяспека таксічных рэчываў тытунёвага дыму ўзмацняецца тым, што яны паглынаюцца сценамі, сталлю, долам, мэбляй, а пасля мігруюць у паветра памяшканняў.

Курэнне як псіхалагічная залежнасць звычайна кампенсуе пэўную ўнутраную праблему, якая мела месца на момант першай спробы. Так што залежнаму неабходна вучыцца вырашаць праблемы. Можна прыцягнуць да гэтага спецыялістаў — псіхолага, псіхатэрапеўта, нарколага. Аднак трэба мець на ўвазе, што пры вялікім жаданні, моцнай матывацыі можна справіцца і самому. Самае важнае — не адкладваць прыняцце гэтага рашэння на пасля.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Як пазбегнуць цэркарыёзу?

На мелкаводдзі, якое добра праграваецца сонцам, ствараюцца спрыяльныя ўмовы для размнажэння і развіцця лічынак гельмінтаў вадаплаўных птушак — цэркарыяў.

Пра гэта карэспандэнту агенцтва «Мінск—Навіны» паведаміў **урач-паразітолаг Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Андрэй ВЕДЗЯНЬКОЎ.**

— Цэркарыі — гэта не бачныя няўзброеным вокам мікраарганізмы, здольныя свабодна перамяшчацца ў вадзе, збірацца ў прыбярэжнай воднай расліннасці і актыўна нападаць на вадаплаўных птушак або чалавека, — папярэдзіў доктар. — У людзей, якія падоўгу знаходзяцца ў вадзе з цэркарыямі, можа развіцца хваравіты стан — шыстасаматыдны алергічны дэрматыт (цэркарыёз), ці, прасцей, сверб купальшчыка. Сімптомы захворвання могуць праявіцца праз некалькі гадзін пасля выхаду з вады. У месцах пранікнення лічынак гельмінта (галёнкі, сцёгны, ягадзіцы) скура чырванее, адчуваецца паколванне, смыленне, сверб. Затым з'яўляецца высыпка (у выглядзе крапіўніцы), пухіркі памерам з гарошыну, вадыры. Часам пацярпелыя адчуваюць слабасць, галавакружэнне, парушэнне сну. У цяжкіх выпадках (пры множным пашкоджанні цэркарыямі) павышаецца тэмпература, узнікае сухі кашаль. Праз 7—10 дзён сімптомы знікаюць, але пігментацыя скуры на месцы высыпання і лёгкі сверб застаюцца на 2—3 тыдні.

— Каб пазбегнуць заражэння, купайцеся на спецыяльна абсталяваных пляжах, далей ад рачных малюскаў і месцаў гнездавання вадаплаўных птушак, — параіў урач.

Вольга ГРЫГОР'ЕВА, «Мінск—Навіны».

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ, г. Дзяржынск.



«ЭХ, ЧАС КАСЬБЫ, ВЯСЁЛЫ ЧАС!»

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: 1. «Час вам косы кляпаць, час вам на ... «. («Касцам». Я.Купала). 4. Арфаграфія. 10. Невялікае лісцевае дрэва, якое цвіце ў чэрвені, кветкі яго нагадваюць 5-канцовыя зорачкі. 12. «Хрушч у літаўры шарахнуў мядзяныя,\\... загудзеў, чмялянят аклікаючы». («Канцэрт у сене». М.Танк). 13. У сошкі залатыя ...(прык.). 14. Рачная рыба, якая добра клюе ў чэрвені, калі цвіце шыпшына. 15. Высокая агароджа. 16. Вялікі і густы лес. 15. Лаўка ў сялянскай хаце. 19. У антычныя часы — святкаванне ў гонар бога віна і вінаробства. 23. «Мядовы ... яблынь, сена». («Ліпеньскім ранкам». М.Ляшчун). 24. Меданосная расліна; чэмпіёнам сярод лясных раслін-... лічыцца маліннік, які цвіце ў чэрвені. 27. Які куст, такі і ...(прык.). 28. Калі нябудзь, дык і ... (прык.).

Па вертыкалі: 1. Рэч, якую нагадвае малады парастак сасны. 2. Адмоўны адказ на пытанне. 3. Кветкі-... . Легендарныя белыя вадзяныя кветкі, якія ўтварыліся з затанулых у возеры Свіцязь жыхароў аднайменнага горада. 5. На Кузьму і Дзям'яна касіць не ...(прык.). 6. Танцавальны крок. 7. Птушка атрада вераб'іных. 8. Рака, левы прыток Нёмана. 9. У гародзе летам цвіце жоўтым цветам, вышэй за ўсіх узняцца рад, бо ён сонцу малодшы брат (заг.). 11. Мануіл — .... Прысвятак, які прыходзіцца на 30 чэрвеня; у гэты ж дзень адзначалі і Русалчын розыгрыш, калі засцерагаліся русалак. 16. Прэснаводная рыба сямейства карпавых, якая добра ловіцца, калі цвіце акацыя. 18. Працэс адкладвання самкамі рыб ікры, які на Беларусі заканчваецца ў чэрвені. 20. Не помніць карова зімы, дачакаўшы ...(прык.). 21. «Эх, ... касьбы, вясёлы ... !». («Новая зямля». Я.Колас). 22. Выходзіць на ... з расой, дык будзеш з ядой (прык.). 25. Круты бераг. 26. Вязкі асадак на дне вадаёмаў.

Па гарызанталі: 1. Сенажаць. 4. Прадаванік. 10. Кружыліна. 12. Чмель. 13. Рожкі. 14. Акунь. 15. Цыганка. 16. Тлушча. 17. Услон. 19. Орлік. 23. Водар. 24. Мелаваос. 27. Аддостак. 28. Неўмагот.

Па вертыкалі: 1. Сенажаць. 2. Не. 3. Царык. 5. Рана. 6. Па. 7. Сініца. 8. Уша. 9. Званенчік. 11. Сонцастой. 16. Плотка. 18. Нерэст. 20. Лета. 21. Час. 22. Поле. 25. Яр. 26. Іл.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	5.13	21.18	16.05
Віцебск	4.57	21.14	16.17
Магілёў	5.03	21.08	16.05
Гомель	5.07	20.57	15.50
Гродна	5.30	21.32	16.02
Брэст	5.38	21.25	15.47

Месяц

Апошняя квадра 29 ліпеня. Месяц у сузор'і Рыб.

Імяніны

Пр. *Антона, Гаўрылы, Івана, Сцяпана, Юльяна.*
К. *Ганны, Гражыны, Міраслава, Аўхіма, Лаўрэнція.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА	+24..+26°С	КІЕЎ	+24..+26°С	РЫГА	+19..+21°С
ВІЛЬНЮС	+20..+22°С	МАСКВА	+17..+19°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+18..+20°С

УСМІХНЕМСЯ

У бары.

— У вас піва свежае?

— Свежае! Толькі прывезлі, я яго нават разбавіць не паспела.

Суседзі, радуйцеся! Мы скончылі рамонт, які доўжыўся два гады. Перфаратар і дрыль я прадала, а на атрыманыя грошы купіла караоке!

Жонка — мужу:

— Ты дзе быў?

— На вяселлі ў Юры... Ты не ўяўляеш сабе, як там усе напіліся!

— Ну чаму ж не ўяўляю... Фату здымі.

Працаўніца пошты Расіі ідзе дадому тыдзень.

Чатырохгадовая дачка — тату:

— Не крычы на мяне, я табе не жонка!

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н.КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара—галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by,

(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 23.891. Індэкс 63850. Зак. № 3165.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 25 ліпеня 2013 года.